PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 33 (2466) Год XLVIII Беласток, 17 жніўня 2003 г. Цана 2,00 зл.

Чацвёртыя „Беларускія трыялогі” — Крынкі, 28-30 ліпеня

Сакрат ідзе на Венгрыю

Мікола Ваўранюк

— Як думаеце, колькі беларускіх пісьменнікаў мае свае біяграмы ў 20-томнай вянгерскай энцыклапедыі? — запытаў Лаяш Палфалві ўдзельнікаў „Беларускіх трыялогаў”.

— Чатырох, — упэўнена адказаў Сакрат Яновіч, гаспадар сустрэчы.

Астатнія не рашаліся на канкрэтны адказ. Паглядалі адзін на аднаго і пацiскалі плячыма. Хтосьці нясмела сказаў: адзін-двух. Іншы: дзесяць. А самы адважны рашыўся назваць лічбу трыццаць.

— Дзвесце дзевятнаццаць, — з усмешкай рассакрэціў правільны адказ на сваё пытанне Лаяш Палфалві. Усе прысутныя аж ахнулі ад здзіўлення.

Пасля такога паведамлення здавалася б, што мадзьяры дасканала ведаюць беларускую літаратуру. Нічога падобнага! Хаця на вянгерскую мову перакладзены многія творы беларускай літаратуры, аднак толькі нямногія тамака адрозніваюць Васіля Быкава ад Канстанціна Сіманава. Для іх усё гэта была савецкая літаратура, якая, як правіла, перакладалася з рускай мовы. Гэты працэс спыніўся ў 1990 годзе, разам з развалам Савецкага Саюза і ўсяго сацыялістычнага лагера. Памяткай такога часу з’яўляецца мёртвы корпус тэкстаў, да якіх сёння ніхто не звяртаецца, гаварыў Лаяш Палфалві.

Цяпер толькі зрэдзь часу даходзяць да венграў беларускія літаратурныя навінкі. Няма чалавека здольнага перакладаць беларускія тэксты з арыгінала. Ці ў даны момант, у пераходны перыяд, пакуль не будзе спецыялістаў-беларусістаў, можна займацца перакладамі з дапамогай іншых моў, напрыклад, польскай? — дапытваўся Лаяш Палфалві.

Адназначнага адказу не атрымаў, бо такіх адказаў „Беларускія трыялогі” не даюць. Гэтыя сустрэчы маюць характар свабодных дыскусій-сімпозіумаў. Іх роля ў тым, каб менавіта спараджаць пытанні, называць праблемы, пераадольваць перашкоды шляхам папулярызацыі беларускай літаратуры, беларускай культуры ў Еўропе. Кожны год „Трыялогі” пашыраюць беларускую праблематыку на новы рэгіён, новую краіну.

— Гэта дальнабачнасць Сакрата Яновіча, — гаворыць Іван Бурлыка з Гродна. — Кожны ўдзельнік гэтых сустрэч, вярнуўшыся дадому, станецца прапагандыстам беларускай літаратуры. У першую чаргу пашырыць кола чытачоў выдання „Annus Albaruthenicus”, якое з’яўляецца плёнам „Трыялогаў”.

Чацвёртыя „Беларускія трыялогі” былі скіраваныя на Цэнтральную Еўропу,

[працяг ☞ 2]

Фота Аляксея Мароза

Жніво з дажджамі

Сёлета жніво распачалося рана, але з-за дажджоў гаспадары вымушаны спыняць малацьбу. З-за засухі і зімовых маразоў сёлетні плён ніжэйшы ад мінулагодніх. Хаця ў Бельску-Падляшскім працуе некалькі пунктаў скупкі збожжа з даплатамі з дзяржаўнага бюджэту, мала гаспадароў рашаецца прадаваць яго ў пачатку жніва.

Непадалёк ад Гайнаўкі ўбачыў я чырвоны камбайн, з якога высыпалася пшаніца. Грыша Мароз з Новага Беразова хацеў хутчэй змалаціць збожжа і рашыўся ўзяць камбайн з Сельскагаспадарчага кааператыва ў Гайнаўцы.

— Слабы сёлета плён, бо збожжа засохла. З такога вялікага кавалка намалацiў прычэп пшаніцы і тое, што зараз знаходзіцца ў другім, — селянін паказаў на прычэп. — Можа і трох тон з гектара не атрымаю. Трэба малаціць недасушанае збожжа, бо, мабыць, хіба ізноў пойдзе дождж.

Калі мы размаўлялі, пачаў крапаць дожджык. Пасля хутка пачало цямнець і пайшоў вялікі краплісты дождж. Грыша Мароз ледзь паспеў закончыць малацьбу пшаніцы. На другім участку засталося яшчэ даспелае збожжа.

Схаваўшыся ад дажджу, паразмаўляў я ў Новым Беразове аб жніве з пенсіянерам, які пасеяў толькі жыта і ячмень.

— Сёлета было вельмі суха, а зімой частка збожжа вемерзла. Апошнім часам увогуле не было дажджу і толькі ў час жніва ападкі пачалі нам перашкаджаць малаціць. Ячмень рэдка пасходзіў. Не ведаю ці тры тоны з гектара збяру. Плён жыта крыху лепшы, можа тры з паловай тоны будзе. Мой кум пасеяў сёлета рапс, то толькі дзве з паловай тоны сабраў з гектара, — заявіў мой суразмоўца. — Гэты дождж, што ідзе, перашкаджае толькі жніву, але поле яго вельмі патрабуе. Зараз зямля настолькі высахла, што ўвогуле нельга араць.

У некаторых гмінах Гайнаўшчыны вялікі дождж спыніў жніво на два дні. Асабліва дакучлівым зрабіўся ён для жыхароў тых вёсак, у якіх няма прыватных камбайнаў. Людзі вымушаны ездзіць у суседнія вёскі і прасіць камбайнераў выканаць паслугу. У Тапарках, распаложаных у Кляшчэлеўскай гміне, ёсць свой камбайн. У сонечнае надвор’е яго ўласнік паспявае змалаціць усё збожжа ў вёсцы. Аднак сёлета дождж некалькі разоў спыняў працу і гаспадары хочуць запрасіць камбайнераў з суседніх вёсак.

— Калі дачакаюся камбайна, змалачу авёс. Пасля апошняга дажджу крыху прыбіла яго да зямлі і пачынае асыпацца, — сказаў Антон Мрук з Тапаркоў. Пасля абеду ўдалося яму змалаціць авёс. З іншым збожжам давялося чакаць.

— У нас камбайнер рашае, якое збожжа малаціць у першую чаргу. Адзін раз наша збожжа жалі апошнім, бо камбайнер сказаў, што яно можа яшчэ доўга стаяць, — патлумачыла жыхарка Тапаркоў. За жнівом наглядаюць работнікі Дарадчага сельскагаспадарчага калектыва з Гайнаўкі. Ацэньваюць яны, што на Гайнаўшчыне сёлетні плён будзе ніжэйшы ад мінулагодніх, залежна ад якасці зямель, на 10-20%. Найбольшая трата будзе на землях нізкай якасці, распаложаных у Чаромхаўскай, Кляшчэлеўскай, Дубіцкай, Нарваўскай і Нараўчанскай гмінах. У Гайнаўскай і Чыжоўскай гмінах найлепшыя на Гайнаўшчыне землі, але там частку збожжа прыбіў да зямлі дождж.

— Да паніжэння плёнаў збожжа спрычынілася засуха, якая была восенню і вясной. Зімовыя маразы і замаразкі дадаткова абмежавалі ўраджай, — лічыць Геранім Панятоўскі, кіраўнік Дарадчага сельскагаспадарчага калектыва.

Аляксей Мароз

Сяброўская бяседа ☞ 3

„Сяброўская бяседа” гэта прамоцыя таксама і Гарадоцкай гміны. На расстаўленых пад соснамі століках можна было пацікавіцца і часопісам „Гарадоцкія навіны”, набыць паштоўкі, агратурыстычныя карты Гарадоцкай ды Міхалоўскай гмін. Варта паказваць свае добрыя якасці, асацыявацца і сваім, і гасцям тым, што ў нас самае файнае.

Беларуса на сенатара! ☞ 4

Я, вось, так сабе думаю, што калі б беларусы мелі свайго кандыдата, магчыма, што таксама злілі б свае рады. Гляньце на апошнія самаўрадавыя выбары. Без палітычнага партыйнага хваста і без падтрымкі Царквы Беларускі выбарчы камітэт дасягнуў нядрэннага выніку. А калі б нават беларускі кандыдат не ўвайшоў у Сенат, то была б гэта неблагая нагода публічна выказацца аб праблемах асяроддзя.

Рукадзелле, спевы і жніво ☞ 5

„Ой чыя то волока, доўгая і шырока” заводзяць адкрытым голасам жніўную старажытную песню рукадзельніцы. Этна-народнага спеву навучае Анна Фіёнік. Пасля курсаў архаічнага спеву яшчэ больш палюбіла мясцовыя падляшскія напевы. Напрыклад, жніўныя песні, яны нібыта на адну мелодыю, але якія багатыя ў дэталях.

Свята душы ☞ 8

„Бераставіцкія музыкі” чарговы раз выйшлі на сцэну і чарговы раз атрымалі бурныя апладысменты. Публіка дзякавала любімым выканаўцам — Марыі Юшкевіч і ўсім членам калектыву. Пасля канцэрта артысты доўга размаўлялі з гледачамі, мясцовымі беларусамі. Землякам хацелася пагаварыць, адцягнуць момант расстання.

Гулялі і адпачывалі ☞ 9

Гайнаўскае аддзяленне Праваслаўнага брацтва св.св. Кірылы і Мяфодзія, якое дзейнічае пры Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы, у час сёлетніх канікулаў пяты раз арганізавала адпачынак для дзяцей.

Столяр што калаўроты рабіў ☞ 10

Мы з бацькам выконвалі драўляныя ўпрыгожанні дамоў, вокан, ганкаў. Пасля заканчэння палявых работ пачынаўся ў нас сезон вытворчасці калаўротаў. Для гэтай справы выкарыстоўвалі мы лісцевую драўніну: мяккую і лёгкую ліпу ды альшыну і цвёрдую бярозу.

Беларусь — беларусы

Фота МІКОЛЫ ВАЎРАНЮКА

Сакрат Яновіч (другі справа) паказвае гасцям Крынкі. Стаяць справа: Рышард Радзік (Люблін), Іван Бурлыка (Гродна), Майкл Флемінг (Лондан), Лаяш Ондраш (Будапешт).

Сакрат ідзе на Венгрыю

[1 ☞ працяг]

перш-наперш, Венгрыю. Ондраш Зольтан даказаў, што сувязі беларускай і венгерскай літаратур намнога старэйшыя за пасляваенныя, так сказаць, сацыялістычныя. Як прыклад прывёў старабеларускі пераклад „Гісторыі Атылы, караля угорскага" Міклоша Олаха, які быў зроблены каля 1580 года і захоўваецца ў Бібліятэцы Рачынскіх у Познані.

Аб прысутнасці беларускай літаратуры, беларускіх аўтараў у Нямеччыне гаварыў Генрых Бэрэзка з Берліна. Альжбета Чыквін тлумачыла гасцям з замежжа феномен тых, хто стварае гэтую літаратуру — беларусаў як групы азначанай стыгматам. Сваімі назіраннямі збоку на беларускую нацыянальную меншасць у Польшчы дзяліўся Майкл Флемінг з Лондана. А Рышард Радзік з Любліна два дні прабаваў дайсці хто такія беларусы. Калі паляку здаемся дзіўнымі, дык пра больш аддаленыя нацыі няма чаго і казаць. Многа працы, значыць, наперадзе ў таварыства „Віла Сакратас" — арганізатара „Трыялогаў", — каб прызвычаіць Еўропу да беларусаў ды іх культуры.

Абы толькі не стараліся папулярызаваць такую музычную культуру, якую запрэзентавалі на „Трыялогах" Ала і Мікола Яцковы з Магілёва. Іхнія песні падыходзілі б да „Славянскага базару" ў Віцебску, або да нашых масавых фальклорна-папсовых летніх фэстаў БГКТ. „Беларускія трыялогі", гэта, усё-ткі, эліtарная сустрэча. Гаспадар мог бы пашкадаваць вушэй людзей, якія, думаю, не захапляюцца эпігонскай музыкай скампіляванай камп'ютэрам.

Быў гэта, на шчасце, адзіны скрыгат падчас трохдзённай сустрэчы. Усё астатняе — гасціннасць Міраславы і Марка Маршалкаў з Лапічаў, у чыёй гаспадарцы яна праходзіла, і экскурсіі па Крынках ды наваколлі, якія наладзілі прыезджым арганізатары — было найвышэйшай пробы.

* * *

— Я адчуваю радасную стому, — гаварыў Сакрат Яновіч пад канец „Трыялогаў". — Пачыналі мы нашу імпрэзу вельмі скромна. З кожным годам, аднак, яна расце, прыязджаюць да нас усё новыя людзі, дыскусіі становяцца ўсё цікавейшымі. Магу ўпэўнена сказаць, што я задаволены зробленым.

„Беларускія трыялогі" сталіся настолькі слаўнымі, што сёлета не маглі іх абмінуць самаўрадавыя ўлады Падляшскага ваяводства. І маршалак Януш Кшыжэўскі, і старшыня ваяводскага Сейміка Збігнеў Кшывіцкі не шкадавалі Сакрату Яновічу слоў прызнання. Гаварылі штосьці пра абавязак улад фінансаваць культуру, але неяк цьмяна. Затое Марцін Рэмбач — старшыня Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь, які фінансаваў сёлетні сімпозіум — сказаў канкрэтна:

— Абяцаю, што „Беларускія трыялогі" будуць і ў наступным годзе.

Мікола ВАЎРАНЮК

Вярхоўны суд адмовіўся рэабілітаваць Ларысу Геніюш

Беларускі Хельсінскі камітэт 9 ліпеня звярнуўся да кіраўніка дзяржавы з просьбаю рэабілітаваць Ларысу Геніюш. У 1949 годзе паэтка была асуджана да 25 гадоў зняволення паводле абвінавачання ў падрыўной дзейнасці супраць СССР. Яна датэрмінова была вызвалена ў 1956 годзе і да сваёй смерці ў 1986 годзе жыла ў пасёлку Зэльва, што ў Гродзенскай вобласці пад наглядам КДБ. У лісце БХК да Лукашэнкі адзначаны шэраг юрыдычных матываў: Геніюш была асуджана не з'яўляючыся грамадзянкаю БССР, з матэрыялаў яе справы вынікае, што ёй інкрымінавалася сяброўства ў арганізацыях Беларуская Рада і Беларуская народная самапомач, якія, адзначае Беларускі Хельсінскі камітэт, не вялі антысавецкай ці прафашыстоўскай дзейнасці. Апроч іншага, камітэт адзначае, што артыкулы крымінальнага кодэкса, паводле якіх Ларыса Геніюш была асуджана, былі скасаваны ў 1960 годзе, што паводле заканадаўства мусіць цягнуць за сабою скасаванне прысуду і рэабілітацыю.

У 1999 годзе БХК ужо звяртаўся ў Генпракуратуру Беларусі з просьбаю апратэставаць прысуд Ларысе Геніюш і яе мужу Яну. Справа была накіравана ў Вярхоўны суд, які пастанавіў, што Ларыса Геніюш увогуле не падлягае рэабілітацыі. Было таксама паведомлена, што матывы гэтага могуць быць абвешчаны толькі самой рэпрэсіраванай.

Цяперашні зварот Хельсінскага камітэта Аляксандр Лукашэнка пакінуў без адказу, пераадрасаваўшы яго Вярхоўнаму суду. А Вярхоўны суд пацвердзіў сваю ранейшую пазіцыю, адказаўшы, што Ларыса Геніюш была абгрунтавана прызнаная не падлягаючай рэабілітацыі.

„Биржа информации", 31.07.2003 г.

Бясконцая прага бясконцай улады

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, нягледзячы на ўсе хібы і непаразуменні, што ўзніклі апошнім часам у галіне „саюзнага будаўніцтва", заўзята спрабуе выйсці на расійскае палітычнае поле. І для гэтага падвяргае сённяшняе кіраўніцтва Расіі такой крытыцы, якая старонняму назіральніку можа падацца ўмяшаннем ва ўнутраныя справы суседняй дзяржавы.

Пачатак гэтага месяца адзначыўся буйной прапагандысцкай акцыяй беларускага прэзідэнта перад расійскімі сродкамі масавай інфармацыі. Дзеля гэтага, коштам таксама і беларускіх падаткаплацельшчыкаў, у Мінск былі запрошаны 70 расійскіх журналістаў, большай часткай з правінцыі. Для іх была праведзена адмысловая прэс-канферэнцыя А. Лукашэнкі, які ўсімі сіламі імкнуўся даказаць, што ён зусім не такі, якім яго прадстаўляюць цэнтральныя расійскія СМІ і ў Беларусі ўсё нашмат лепей, чым у Расіі.

Пачаўшы з выражэння ўдзячнасці расійскім рэгіёнам, з дапамогай якіх, нібыта, удалося захаваць Саюз Расіі і Беларусі, А. Лукашэнка звярнуўся да тэмы мінулай вайны, дзе „мы абаранялі Расію. Мы абаранялі Маскву" і заявіў аб тым, што „мы будзем рабіць усё, каб вы — рускія людзі — ведалі, што тут (у Беларусі) лепей для рускага чалавека, чым у Расіі".

Падчас прэс-канферэнцыі беларускі прэзідэнт паскардзіўся, што цэнтральныя расійскія тэлеканалы ў большасці сваёй замоўчваюць падзеі, якія адбываюцца ў Беларусі альбо „снимают всякую грязь". Таму і з'явілася патрэба такой сустрэчы.

Адказваючы на пытанні, А. Лукашэнка папракаў расійскае кіраўніцтва за нецікавасць да беларускага пункту гледжання ў вырашэнні калінінградскай праблемы. Беларускі лідэр наўпрост заявіў, што „мы лепей ведаем, што адбываецца ў Калінінградзе і вельмі многае можам зрабіць для Расіі ў плане забеспячэння гэтых людзей і стварэння нармальных умоў і для перамяшчэння калінінгадцаў, і для жыцця... Мы ў стане забяспечыць гэты мільённы анклаў усім неабходным". Ствараецца ўражанне, што гэта не Беларусь у Расіі, а Расія ў Беларусі просіць разнастайныя крэдыты, вінаваціцца за энерганосьбіты і выпрошвае прадаваць нафту і газ па нізкіх цэнах.

Нічога не вартай аказалася і дружба Пуціна з Бушам, бо па словах беларускага прэзідэнта, расійскія кампаніі не маюць доступу да іракскай нафты.

Заяўляючы аб тым, што болей улады А. Лукашэнку не патрэбна, ён, разам з тым, незадаволены, што ў Расіі не жадаюць, каб на „агульным полі не толькі ў эканоміцы, але і ў палітыцы з'явіцца не толькі Лукашэнка, а і Латыпаў (кіраўнік адміністрацыі прэзідэнта РБ), многа іншых разумных людзей з Беларусі". Калі зважаць на занадта частыя непаразуменні ў пытаннях эканамічнай інтэграцыі, гэта тычыцца і пераходу на расійскі безнаяўны рубель, непрыватызацыя расіянамі беларускіх нафтагазавых прадпрыемстваў, прыходзіш да высновы, што агульнае эканамічнае поле можа з'явіцца толькі тады, калі беларускаму прэзідэнту і яго атачэнню будзе дадзена магчымасць стаць у шэрагі расійскай палітычнай эліты.

Але з іншых адказаў на пытанні вынікае, што пакуль гэта мэта застаецца недасягальнай, бо нават усе тэрміны правядзення чарговага пасяджэння беларуска-расійскага Вышэйшага дзяржаўнага савета выйшлі, а яго ўсё няма. А. Лукашэнка прызнае, што калі Беларусь чаго-небудзь захоча, а Расія — не, то гэтага ніколі не будзе. А калі чагосьці моцна захоча Расія, а Беларусь — не, то гэта магчыма. Тым не менш, па меркаванні беларускага лідэра, такая пастаноўка пытання не тычыцца ягонай магчымай трэцяй кадэнцыі на пасадзе прэзідэнта, бо „рашаць будзе беларускі народ. Калі мяне абралі ў 1994 прэзідэнтам, Масква рабіла стаўку на Кебіча, але народ абраў іншага".

Цікава, што ў адрозненні ад іншых народаў беларусы маюць не толькі абіраць прэзідэнта на пэўны тэрмін, але і галасаваннем падцвярджаць магчымасць ягонага сыходу з найвышэйшай дзяржаўнай пасады. „Таму нават калі я буду сыходзіць, я ўсё роўна, гэта галоўнае, буду сыходзіць праз народ, каб народ на рэферэндуме сказаў «не» Лукашэнку". Нібыта нормы вызначаныя канстытуцыяй ужо не дзейнічаюць.

Невыключана, што дадзеная прэс-канферэнцыя мела на мэце не столькі прыгожы расповед аб беларускім прэзідэнце ў расійскіх рэгіёнах, бо там хапае сваіх праблем, ды і федэральная ўлада ў пуцінскай Расіі мацней за ельцынскую. Хутчэй — дасягненне праз прэсу і прадстаўнікоў рэгіёнаў нейтральнага стаўлення Крамля да жаданняў Аляксандра Лукашэнкі захаваць уладу ў Беларусі на нявызначаны тэрмін. А далей, чым д'ябал не жартуе, можа і шлях на Маскву адкрыецца.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Выйшаў слоўнік „Беларускі рух хрысціянскі XX стагоддзя"

Выйшла друкам першая ў Польшчы абшырная публікацыя на тэму беларускага рэлігійнага жыцця XX стагоддзя — біябібліяграфічны слоўнік „Беларускі рух хрысціянскі XX стагоддзя" Юрыя Грабінскага і Юрыя Туронка.

Слоўнік складае збор асноўных інфармацый на тэму духоўных і свецкіх творцаў ды дзеячаў, якія заслужыліся ў беларускім хрысціянскім руху. 230 біяграфічных артыкулаў датычыць як асоб жывых, так і памерлых.

У кнізе прадстаўлены жыццяпісы, мартыралогія і абшырныя біяграфіі духоўных некалькіх праваслаўных епархій ды каталіцкіх дыяцэзій і архідыяцэзій. У слоўніку можна знайсці матэрыялы, між іншым, на тэму Беластоцкай, Драгічынскай, Мінскай і Віленскай дыяцэзій.

У артыкулах змешчаны біяграфіі, інфармацыі аб душпастырскай службе і грамадска-культурнай дзейнасці, дыяграмы, бібліяграфія.

ПАП, 8.08.2003 г.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

За сямейным сталом — вядучыя канцэрт

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

„Нараўчанкі" вядзе цяпер Пятро Скепка (справа з гармонікам)

Сяброўская бяседа

Гарадоцкае таямнічае ўрочышча Барык у апошні час кішыць ад тысяч людзей. Толькі што адгрымеў Фестываль музыкі маладой Беларусі, як сабраліся госці на „Сяброўскую бяседу". У гарачую суботу 2 жніўня на міжнародную імпрэзу запрасіла Гарадоцкая гміна і БГКТ. Мерапрыемства (чацвёрты выпуск) мае ўжо сваю традыцыю, са смачным пачастункам для душы і цела. Калектывы, выступаючыя на сцэне, прывозяць з сабою таксама адмысловыя гасцінцы, якія пасля ставяць на доўгім, багатым стале пад сцэнай, а на сцэне за сталом — таксама сваякі — радзіна гарадоцкая, з бабуляй Нінай, унучкамі Багусяй, Эвелінай, Міхасём, Валяй, Юркам... За імі — палотнішча намаляванае Марыяй Мялешка — беларуская хата ў атачэнні бяроз і мальваў. А публіка, рассеўшая на лавах, на паляне і на ўзлесках таксама частуецца, слухае спеваў і сама пяе. Словам — у шчырай сябрыне плыве час, і не заўважыш, як і поўнач, і ноч глыбокая... Над старажытнымі соснамі гучыць разнамоўная песня, пырскаюць феерверкі... Песня розная — і народныя напевы, вядомы ўсім, і нават рок у выкананні гарадоцкай „Рымы". І „Асенні ліст" — дзяды рымаўцаў. З Беларусі, з Падляшша. І маладыя, і немаладыя, ды маладыя духам.

— Як гуляеце?! — дапытваецца са сцэны найбольш вядомы прымак Беласточчыны — дырэктар Гарадоцкага дома культуры Юрка Астапчук. Добра гуляюць! Пачаў „Расспяваны Гарадок", далучыліся бельскія „Васілёчкі", „Арэшкі" з Арэшкава, „Нараўчанкі" з Нараўкі (вядзе іх цяпер дубінец Пятро Скепка, які аднавіў таксама і „Дубіны"; яны таксама выступілі), „Чыжавянє" з Чыжоў, „Каліна" ды малады яе парастак „Калінка" з Залук, „Таневічанкі" з Тыневіч, новыя, мужчынскія „Куранты" з Бельска (пад рукою Аліны Кос), „Збучанкі" са Збуча, „Крыніца" з Беластока, „Рэчанька" з Козлік, ляўкоўскія „Цаглінкі", арлянскія „Арлянє", „Журавінкі" з Агароднічак, маладыя беластоцкія „Каласкі", „Незабудкі" з Курашава, „Хутар" з Гарадка, гайнаўскі хор, „Красуні" з Краснага Сяла, ну, і з Беларусі „Шкляры" з Бярозаўкі (прывезлі яны падарунак — агромны крышталёвы келіх, каб было ў ім багата ўсяго) ды растанцаванае, расспяванае „Стрэчанне" з Мазыра. Былі таксама маладзенькія палякі — „Клекацякі" з Боцькаў, якія прыгожа танцавалі падляшскія польскія танцы. А перш за ўсё рэй вадзілі „Прымакі" — гаспадары з нястомным Юркам. Яны і гралі далёка ноччу, бо народ хацеў гуляць ды цешыцца далей. Гэта ўжо было пасля канцэрта і ашаламляльнага паказу феерверкаў, якія ўзляталі тысячамі каляровых зорак над аўсяным полем на ўзлеску Барыку.

Народ сабраўся і вясковы, з акалічных мясцовасцей Гарадоччыны, былі і гайнавяне, і беластачане, і галандцы. „Smereke" teraz!, „Судзьбу!" — патрабавалі найбольшых падляшскіх гітаў слухачы. Сярод жаданых гасцей — сам пасол Беларусі Павел Латушка з жонкай Наталляй, консул Аляксандр Карачун. Прысутнічалі і святары праваслаўны ды каталіцкі, прадстаўнікі арміі ды палітыкі. Прывітанне ад падляшскага маршалка перадаў Ян Сычэўскі, старшыня БГКТ і член кіраўніцтва падляшскага самаўрада.

„Сяброўская бяседа" гэта прамоцыя таксама і Гарадоцкай гміны. На расстаўленых пад соснамі століках можна было пацікавіцца і часопісам „Гарадоцкія навіны" (гэта цяпер мутацыя гміннай „Tutaj"), набыць паштоўкі, аграгурыстычныя карты Гарадоцкай ды Міхалоўскай гмін. Варта паказваць свае добрыя якасці, асацыявацца і сваім, і гасцям тым, што ў нас самае файнае.

Міра Лукша

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Рэй вадзіў Юрка Астапчук (праз хвіліну выйдуць на сцэну бельскія „Васілёчкі")

Дзень будаўнікоў у Старым Ляўкове

З жніўня Прадпрыемства будаўнічай керамікі ў Старым Ляўкове арганізавала штогодні фэст „Дзень будаўнікоў".

Ад 9 гадзіны ў мясцовым амфітэатры адбываліся спартыўна-забаўляльныя конкурсы для дзяцей і моладзі. Найбольш узнагарод заваявалі: Барташ Кардаш, Кінга Кардаш, Пётр Мілько, Марцін Рэент, Дам'ян Субота і Матэвуш Харкевіч. Пасля на спецыяльную пясочную спортпляцоўку выйшлі баскетбольныя каманды. З запалам спаборнічалі яны некалькі гадзін, а пераможцам аказалася каманда Паёнкаў, якая апярэдзіла ПГР Боцькі і ФЦ Джэўцэ. Уступілі ў спаборніцтва лепшыя мясцовыя вудзільшчыкі. Першае месца заваяваў Пётр Прычыніч, другое — Віталь Красоўскі і трэцяе — Радаслаў Вайкоўскі.

Было шмат іншых спаборніцтваў, між іншым, хто надзьме найбольш паветраных шароў, хто падыме найбольш цэглаў, хто пабудуе з цэглаў найпрыгажэйшы комін ды хто злепіць з гліны найпрыгажэйшую фігурку і г.д. У гэтай апошняй канкурэнцыі — разьба ў гліне — першынство заваявала Моніка Зялінская, другое месца заняла Каміля Падзеўская.

Пасля поўдня з прывітальным словам выступіў старшыня ПБК Аляксандр Бандарук. Папрасіў гасцей заняць спецыяльна забраніраваны ім месцы на лавачках у амфітэатры. На свята прыехалі м.інш. гайнаўскі староста Уладзімір Пятрочук, старшыня нараўчанскай Гміннай рады Славамір Кулеша, дырэктар Беластоцкага прадпрыемства будаўнічай керамікі Пётр Бурак. Ад імя гасцей з найлепшымі пажаданнямі, накіраванымі да ляўкоўскіх керамікаў у сувязі са святкаваннем Дня будаўнікоў выступіў войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч.

У мастацкай частцы выступілі стараляўкоўскія „Цаглінкі". Прыгожа спявалі яны беларускія песні. На акардэоне віртуозна іграў мастацкі кіраўнік калектыву Мікалай Мяжэнны з Гродна.

Затым песні Марылі Радовіч выконвала вакалістка Марлена, а калектыў „Andro Verde" зайграў цыганскую музыку. Канцэрт быў усім даспадобы.

Фэст арганізоўваюць таксама дзеля шырэйшай папулярызацыі фірмы. Прыгадаем, што прадпрыемства ў Ляўкове будавалі ў двух этапах. У 1968 годзе пачаў працаваць першы фабрычны цэх і выпускаў ён дрэнажныя трубкі. Пяць гадоў пазней закончылі пабудову другога большага цэха па вытворчасці цэглы і керамічных пустакоў. Пачыналі ад чатырох прадуктаў, а цяпер свой асартымент папрадпрыемствы: адно гліны, другое пяску. Цяпер у ляўкоўскім ПБК працуе больш за 120 асоб. Гэта найбольшае прадпрыемства ў Нараўчанскай гміне. Калі б у краіне больш будавалі, ПБК мае магчымасць падвоіць, а то і патроіць вытворчасць. Можа штосьці зменіцца, калі ўвойдзем у Еўрасаюз? Можа будуць больш даступныя жыллёвыя крэдыты? Будаўніцтва з'яўляецца маторам усёй гаспадаркі.

Янка Целушэцкі

Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Спаборніцтва ў падыманні цэглы

Польшча вачыма беларускі

Пульс Варшавы

Ірына Лойка, 22 гады, жыве ў Мастах. Праходзіла пяцімесячнае абучэнне ў Вышэйшай школе журналістыкі імя М. Ваньковіча ў Варшаве і адначасова стажыравалася ў „Газеце выбарчай”. А вось фрагменты яе сталічных назіранняў, апублікаваных на старонках „Газеты Слонімскай”.

Аб студэнтах

Самым крыўдным для беларускага студэнта ў Польшчы з’яўляецца тое, што палякі могуць свабодна выязджаць у большасць краін свету. Напрыклад, адна мая польская знаёмая студэнтка на пытанне: „Што робіш у выхадныя?” адказала: „Еду да сяброўкі ў Нямеччыну”. Іншыя бяруць напракат машыны і едуць кампаніяй у Ірландыю на некалькі дзён. Адурэць можна!

Ім непатрэбна віза, у чаканні афармлення якой або ў тэрмін не пападзеш, або зусім ахвота адыдзе кудысьці ехаць. Тутэйшая моладзь мае намнога больш магчымасцей.

Аб цэнах

Што ў палякаў мне не падабаецца, дык гэта хлеб! Жывучы тут, я вымушана купляць ужо нарэзаны, паколькі звычайны немагчыма рэзаць — ён ламаецца і ўвесь крышыцца, а на смак аддае нейкімі хімікатамі. Палякі інакш думаюць — яны прывыклі або папросту не прабавалі нашага „Нарачанскага”. Хлеб, які я звычайна купляю — „нясмачны” — каштуе 1 000-2 000 беларускіх рублёў. І, пабыўшы тут, не здаецца такім дарагім! Малако ў межах 500-1 500 бел. руб. за літр у залежнасці ад тлушчу. Каўбасу, напрыклад, можна купіць па 3 000 бел. руб. за кілаграм. Праўда, тут ёсць гіпермаркеты, у якіх ёсць магчымасць купіць усё намнога танней, чым у звычайных магазінах. Толькі вось падобныя ўстановы „жаруць” грошы лепш за любую інфляцыю. Прыйшоўшы туды за адной пакупкай, не стрымаешся перад мноствам скідак і „задарма” купляеш і купляеш... Таннейшыя цукеркі, шакалад, рыбу, пральныя парашкі і таму падобнае...

Калі хто з беларускага чалавецтва збярэцца на даўжэйшы тэрмін у Варшаву, раю запасціся ніжняй бялізнай, цыгарэтамі, алкаголем (па неабходнасці), абуткам і касметыкай. Тут усё гэта дабро ў разы тры даражэйшае.

Бары, клубы, вечарынкі

Клубны кактэйль сталіцы Польшчы вельмі разнавобразны. Варшава — моцны пульс суседняй нам дзяржавы.

Яна не ўмее дыхаць раўнамерна, па крайняй меры тая Варшава, якую бачыла я. Дзень пры дні нешта адбываецца. Амаль кожны дзень каля будынка ўрада ў засадзе сядзелі спецназаўцы ў чаканні чарговай калоны забастоўшчыкаў. Пратэставаць палякі ўмеюць і, па-мойму, нават любяць, ці то супраць вайны з Іракам, ці супраць Еўрасаюза, за легалізацыю абортаў або ў абарону правоў жанчын, або... абы была прычына.

Вечарам пульсуе Замкавая плошча: канцэрты, фестывалі і прадстаўленні вулічных артыстаў.

У агульным, жыццё варшавян бурліць! Пульсам жа любой моладзі з’яўляюцца клубы, рэстараны і дыскатэкі.

Лабірынтная тусоўка

Ну, а на дэсерт традыцыйная маладзёжная дыскатэка „Лабірынт” з металашукальнікам і парай выкідалаў на ўваходзе. Дзяўчыны з точанымі фігурамі, хлопцы сатканыя з гары мускулаў — усе яны ў асноўным студэнты, якія прыходзяць патанцаваць пад аглушальныя рытмы. Ніводнай павольнай кампазіцыі! Штаны ў абцяжку, аголены пупок і шклянка „Кока-колы” — ты на вышыні! Грымучая музыка, якая працягвае звінець у вушах, калі ты ўжо вернешся дадому і з задавальненнем упадзеш на ложак.

„Газета Слонімская”,
№ 321 ад 31.07.2003 г.

Пад найяснейшым сонейкам

„Што было, тое і будзе; што рабілася, тое і будзе рабіцца, і няма нічога новага пад сонцам” — пісаў у старажытную даўніну найслаўнейшы мудрасцю ізраільскі цар Саламон. Сёлетняя спёка быццам уторыла яму, што ўжо нічога новага не ўдасца выдумаць і заахвочвала ўсур’ёз да бяздзейнасці. Усё ж такі ў чалавеку хаваецца нейкі пачатак ірацыянальнасці, які і пхае яго ў рызыкоўную актыўнасць. Зачытаў я фразу Яўгена Мірановіча „Маёмасць, якую выпрацавала пасля вайны некалькі пакаленняў палякаў, была разграблена палітычнымі кланамі” („Вяртанне свойскасці”, „Н” № 29) і збунтаваўся супраць сваёй бяздзейнасці...

Якую ж гэта маёмасць выпрацавалі пасля вайны тыя нашы пакаленні? І што грабанулі тыя палітычныя кланы? Ці гэта былі пральныя машыны „Франя”? Ці мо праслаўленыя „малюхі”? А мо мэблесценкі ці „асінобусы”? Здаецца мне, што палітычныя кланы гэтымі пладамі вытворчасці нашых пакаленняў зусім не пацікавіліся. Мо аўтар фразы меў на думцы тую славутую прамысловасць, якая вывела геркаўскую Польшчу ў „першую дзесятку” перадавых краін?.. Праўда, хаця я пільна сачыў за тым спаборніцтвам нашай краіны ў сусветных вярхах, але так і не давялося мне ўлавіць, якое ж гэта канкрэтнае месца займалі нашы: ці яно было толькі дзесятае, ці мо пятае, а мо нават першае; мо калі гісторыкі дакапаюцца ў архівах да гэтай важнай інфармацыі. Але пакуль тое здзейсніцца, то я мяркую, што згаданыя пакаленні няшмат выпрацавалі для будучыні. Тая ўся „Другая Польшча” будавалася коштам замежных крэдытаў і толькі цяпер „выпрацоўвае” яе маёмасць сённяшняе працоўнае пакаленне за мінімальныя зарплаты ці нават яшчэ меншыя ў ценевай сферы. І кошт тае „першае дзесяткі” сёння такі, што не аплачваецца ні даваць легальную працу, ні наймацца на яе. Сёння ў краіне некалькі мільёнаў беспрацоўных, а не меншы лік людзей выконвае найменш прэстыжныя працы па-за яе межамі. Тыя ранейшыя пакаленні ў поўным працаўладкаванні выпрацавалі затое наяўную пенсійную забяспечанасць, якою абцяжараны сённяшні бюджэт, у дадатак да сплаты колішніх даўгоў.

Здаецца мне таксама, што сённяшнія палітычныя лідэры не зацікаўлены і тым капіталам, які астаўся пасля „Другой Польшчы”. Глянуўшы хаця б на беластоцкія „Фасты”, „Агнелу”, „Ухвыты”, „Пакполь” ці нават „Біяззт”, не надта відаць каб каму яны былі надта патрэбныя. Вось некалькі гадоў назад урад наш прадаў найбольшы ў Еўропе папераўтворчы камбінат, калі не памыляюся, за залатоўку. Праўда, былі галасы абурэння, м.інш. выказваўся і адзін з нашых палітычных заступнікаў народа, але ён абурыўся толькі на цану, але не было чуваць закідаў, што адбылося гэта без таргоў. Значыць, „палітычныя кланы” маглі ўзяць гэту дарэмшчыну і за два злоты, але не захацелі яе. Відаць, яны зацікаўлены ў чым іншым...

Сёлетнія галосныя падзеі вакол Нацыянальнага фонда здароўя ці публічнага тэлебачання паказваюць, што палітычная вярхушка зацікаўлена прысмактаннем да абавязковых складчын насельніцтва краіны: грошай з медыцынскай страхоўкі і тэлевізійнага абанемента. Гэта рэальна і без клопату гарантаваныя прыходы, а не нейкі капітал, які ў ходзе рыначных падзей можа патраціць вартасць і скінуць яго ўладальнікаў у рады пралетарыяту.

Астаецца яшчэ пытанне: ці тыя кланы накіраваныя толькі на захоп сабе, а свайму электарату нічога не прапануюць? Ну, стараюцца даваць насельніцтву як мага больш. Якім шляхам? Падобным, як і ў геркаўскі час, з чужой кішэні: ужо сёння ўнутраная задоўжанасць краіны ўдвая большая за славутую вонкавую. Амаль пастаянна прапануюцца казённыя аблігацыі, якія ахвотна купляюць банкі. Таму банкам непатрэбны ні кліенты, ні радавыя працаўнікі, а іх кіраўніцтва жыве прыпяваючы. І тыя задоўжанасці сённяшняга часу прыйдзецца „выпрацоўваць” чарговым пакаленням.

Што было, тое і будзе, што рабілася, тое і будзе рабіцца, і няма нічога новага пад сонцам.

Аляксандр Вярбіцкі

Вачыма паляка

Беларуса на сенатара!

Рушыла выбарчая кампанія. Зноўку. У гэты раз ідзе змаганне за мандат падляшскага сенатара. Гэта з-за прафесара Адама Ямруза, які, адпаведна закону, зрокся мандата пасля свайго выбару ў Канстытуцыйны трыбунал. Мой знаёмы, зыркі назіральнік палітычнага жыцця, з правым ухілам, на маё пытанне, хто ўвойдзе ў Сенат, сцепануў плячыма і сказаў: „А ці гэта штосьці значыць? СЛД у вышэйшай палаце мае і так большасць. Для іх адзін мандат больш, адзін менш — нічога не значыць. Уплыву праз увядзенне аднаго сенатара мець не будуць!”

Тым часам, назіраючы за падляшскім змаганнем здаецца, што барацьба ідзе што найменш за душы. Ліга польскіх сем’яў (LPR) як першая афіцыйна заявіла, што іх кандыдат — Марэк Качынскі з Ломжы, перадавы дзеяч AWS, дэпутат тае ўжо трапіўшай у агонію групіроўкі, раней будучага ў апазіцыі да, як гэта акрэсліваецца наконт рэгіянальных лідэраў СЛД — барона Акцыі, Юзафа Мазалеўскага.

Права і Справядлівасць рашылася на рух яшчэ больш вытанчаны. Запрапанавала дэпутата актуальнай кадэнцыі (дарэчы, таксама і папярэдняй), былога віцэ-прэзідэнта, а потым прэзідэнта Беластока Кшыштафа Юргеля. ПіС, мабыць, мае надзею, што пасля перамогі Юргеля папоўніць свае сеймавыя тылы чарговым дэпутатам. Дарма, Ясю, ходзіш! Чорт* адзін ведае. Паявіўся нават кандыдат намеснік Юргеля Яраслаў Зялінскі (Сувалкі), цяпер бурмістр аднаго з варшаўскіх раёнаў, у часы АВС сядзеўшы на рознай масці пасадах на Падляшшы.

СЛД не прадставіла яшчэ свайго кандыдата, а прынамсі да дня, калі пішу гэтыя словы. Неафіцыйна гавораць аб м.інш. ваяводзе і старшыні рэгіянальнага Саюза Марку Сташлінскім з Ломжы і аб Кшыштафе Білю-Ярузэльскім, радным беластоцкай Гарадской рады, чыя дарога ў Саюз вяла праз ППС і Унію працы. ПСЛ у сваю чаргу, кажуць, бачыць у сенатарскім крэсле дэпутата Мечыслава Багінскага (таксама з Ломжы). Калі гэта праўда, дык групоўка кіруецца падобным прынцыпам што і ПіС, значыць, накарміць яшчэ аднаго свайго члена.

Пакуль што, спробы ў рамках сенатарскай выбарчай кампаніі зводзяцца толькі да палітычных нападаў на СЛД, і, як гэта акрэслілі б лідэры ПіС — падкрэсліванне, што ў польскім палітычным жыцці ёсць месца для правіцы, а СЛД скампраметаваўся і вычарпаў грамадскі давер. Фактычна, гэтая „малая” кампанія гэта перш за ўсё шанц для апазіцыйных груповак паказацца, прыбіць кіруючы лагер і свайго роду практыкаванне перад, можа быць, веснавымі парламенцкімі выбарамі.

Шкада, што беларускае асяроддзе (наколькі я ведаю) не намерваецца паставіць свайго кандыдата. Ніхто не сказаў, што не меў бы ён шанцаў. З уступных калькуляцый вынікае, што прысутнасць 12 кастрычніка ў гэтых дапаўняльных выбарах будзе вельмі нізкая, можа нават у пару працэнт. Да урнаў пойдзе, мабыць, г.зв. злітны электарат, значыць, экстрэмальнай правіцы і лявіцы, да таго таксама часткова. Я, вось, так сабе думаю, што калі б беларусы мелі свайго кандыдата, магчыма, што таксама злілі б свае рады. Гляньце на апошнія самаўрадавыя выбары. Для прыкладу, стартуючы самастойна, без палітычнага партыйнага хваста і без падтрымкі Царквы Беларускі выбарчы камітэт дасягнуў нядрэннага выніку, хоць бы яго кандыдаты Антон Мірановіч ці Яўген Вапа. А калі б нават беларускі кандыдат не ўвайшоў у Сенат, то ў рамках кампаніі была б гэта неблагая нагода, каб публічна і пераканальна выказацца аб праблемах асяроддзя. Урэшце ж, у радыё і тэлебачанні будзе выбарчы бясплатны час. Мець свайго сенатара? Вось гэта было б! А магчы толькі публічна выказаць свае шкадобы, без просьбы, скуголення за доступ да публічных медыяў. Варта.

Мацей Халадоўскі

* Чытай: электарат.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Марыя (на першым плане) і Антаніна Сцепанюк за кроснамі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Удзельнікі „варштатаў”

Рукадзелле, спевы і жніво

— Якія файныя фіранкі! — гляджу на вокны музея — ці гэта карункі, ці можа гафт? Любуюся іх далікатнасцю, лёгкасцю. Як прыгожа яны ажыўляюць драўляную сцяну хаты. Сёння жара, каля трыццаці градусаў. Адчуваю як гэты малы дэталь у здобніцтве прыносіць прыемную ахалоду.

— Не, дзядзька ўзяў паперу і ад рукі іх рабіў.

Jakie one ładne!

— *А вжэ з тканём, то нэ так просто*, — кажа Марыя Сцепанюк са Студзіводаў. Разам з браціхай Антанінай падрыхтавалі ткацкі станок, накінулі аснову з тысячы нітак.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Найбольш спадабалася вышыўка

Калі падыходжу бліжэй, бачу — замест карунак — выцінанкі з паперы. На іх свойскія ўзоры: галубкі, ружы, вінаград. Цешаць яны і смешаць, думаю пра вынаходлівасць продкаў.

— А то пан Анатоль Краўчук з Крывой навучыў нас рабіць аздобы з паперы, — кажа Дарафей Фіёнік, гаспадар і арганізатар Першых варштатаў рукадзелля і спеву, якія з 21 па 26 ліпеня г.г. праходзілі ў Студзіводах.

— Ці вы карысталіся нейкімі ўзорамі? — цягну тэму выцінанкі.

— *Цiелу нуоч нэ спала, думала, што то будэ як мойіе очы нэ вытрывают?* — прызнаецца цётка Марыся. — *Вiедаетэ, коб нэ помыліті нічого. Пры ткані всё трэба так достроіті, коб кажда нітка была дэ трэба. Іначэй нэ выйдэ.*

Апошні раз Марыя Сцепанюк ткала дваццаць гадоў таму.

— *Я і до „Cepelii” належала*, — прыгадвае, — *буольш як пiдiсят iм дывануов выткала.*

За ткацкі станок Марыя села ў 16 гадоў. Ля першай тканіны споўнілася яе малітва. Была вайна, і яе, маладую дзяўчыну, назначылі на працу ў Нямеччыну.

— *А я сiдiела, молiлася і плакала*, — успамінае. — *І Буог даў, што одрочэне далі. — Тэпэр, то ніхто тых нашых дывануов нэ хочэ*, — дадае Антаніна Сцепанюк.

— *У мэнэ, то внучка до Ольштына всё позабірала. Babciu, jakie one ładne!* — прыгадвае другая ткачыха і дадае: — *Бо і ладнэ! А што ж — можэ ніе?*

Марыя Сцепанюк разгортвае чатырохасновавы карычнева-светлы дыван у салярныя арнаменты, ад якіх б’е прамяністасць.

Пытаю дзяўчат-вучаніц што думаюць пра ручное ткацтва.

— Паставім у хаце кросны і будзем вучыцца, — кажуць.

— А кросны дзе возмеш? — пытаю Эвелінку Вышкоўскую, якая ўжо тчэ ў дзве асновы ходнік.

— У бабкі маёй, у Ягуштове.

Зажынкі здымала тэлебачанне

— Найбольш уцягнула мяне вышыўка, — прызнаецца Юстына, гімназістка з Бельска.

— Бо вышываць можна з маршу, вышыўка ў параўнанні з тканнем, простая, — дадае сяброўка Наталля. Курс вышывання вядуць дзве дасведчаныя рукадзельніцы: Марыя Красоўская з Бельска і згаданая ўжо Антаніна Сцепанюк.

— Для нас гэта забава і ідэя на цікаве хобі, — разважаюць дзяўчаты, — а нашы бабулі вышывалі, каб людзі глядзелі і ацанялі іх здольнасці, талент.

— То можа заспяваеце? — прапануе Дарафей Фіёнік. — Бо ў нас, — кажа, — праца і спевы нераздзельныя. Якія песні? Вядома — жніўныя.

„Ой чыя то волока, доўгая і шырока” заводзяць адкрытым голасам жніўную старажытную песню рукадзельніцы. Этна-народнага спеву навучае Анна Фіёнік. Пасля курсаў архаічнага спеву яшчэ больш палюбіла мясцовыя падляшскія напевы. Напрыклад, жніўныя песні, яны нібыта на адну мелодыю, але якія багатыя ў дэталях. Як дапасаваныя сваёй прасторай да краявіду.

— Мы таксама наладзілі зажынкі. Вучыліся рабіць пярэвяслы, пасля вязалі снапкі, паставілі адзін ляшок, — дадае Дарафей. Іх працу здымала тэлебачанне.

— Гэта для тэлебачання? — пытаю.

— Не толькі, — смяецца Наталька, — мы даведаліся, як нашы продкі цяжка працавалі.

Урок жывога пераказу

Сёння ўжо перадапошні дзень варштатаў, пад вечар будзе *грыляванне*, прыйдуць бацькі.

— Хай пабачаць чаго мы тут навучыліся, — кажуць маладыя рукадзельніцы. — Пакажам ім вышыванкі, паспяваем песні. У апошні дзень, каб не расставацца ў слязах, паедзем на веласіпедную экскурсію ў Падбелле і Кнарыды.

— Наведаем святыя месцы і пабачым, якую ролю ў нашых цэрквах займаюць народныя вышыванкі, здобніцтва, тканыя ручнікі і палавікі.

— Нашы заняткі — гэта ўрок жывога пераказу, — тлумачыць сэнс курсаў Дарафей Фіёнік. — Гэта спосаб на рэгіянальную цікавінку або хобі. Вось на Беласточчыне ўсе захапляюцца ткацтвам з Янава, а ў нас усё гэта ёсць. Тканне ў дзве асновы, у чатыры, у пераборы — адным словам — багацце і разнастайнасць. І найважнейшае — ёсць бабулі, якія перакажуць свае ўмеласці і тайны майстэрства маладым.

Ганна КАНДРАЦЮК

XI Дзіцячы пленэр

У Асяродку ўзораў мэблі для дзяцей няпоўнаспраўных у Гайнаўцы, у якім праектуюцца і выпускаюцца драўляныя рэабілітацыйныя прылады, з 1 па 25 ліпеня праходзіў XI Дзіцячы мастацкі пленэр. Больш за трыццаць дзетак, а сярод іх некалькі калекіх асоб, працавалі і гулялі ў трох узроставых групах. Вучні на панадворку асяродка выконвалі мастацкія працы, выкарыстоўваючы розныя тэхнікі, і гулялі. Цікавымі атрымаліся вырабы з гліны, якія пасля выпальваліся ў Ляўкоўскім прадпрыемстве будаўнічай керамікі. Вучні рыхтаваліся да тэатральнага прадстаўлення і з дапамогай апекуноў выконвалі да яго лялькі. Спектакль для бацькоў адбыўся ў апошні дзень пленэру. Бацькі маглі таксама паглядзець велізарную выстаўку з 200 мастацкіх прац.

Ініцыятарам пленэраў з’яўляецца кіраўнік Гайнаўскага асяродка ўзораў Янiна Язерская. Сродкі для гэтага мерапрыемства прыдзялілі ўлады Гайнаўкі — гарадскія і павятовыя. Арганізацыю мерапрыемства падтрымала Студыя ўзораў з Гайнаўкі.

(ам-з)

Фота КРЫСТЫНЫ КАСЦЕВІЧ

Дзіцячы мастацкі пленэр закончыўся спектаклем і выстаўкай

Зорка

старонка для дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Патрыцыя плавае як рыба і адначасова пазірае ў фотааб'ектыў „Зоркі"

Эдзі Агняцвет

Ледзянцы

Аднойчы на канцэрце
Сядзелі малайцы,
Пад музыку смакталі
З ахвотай ледзянцы.

Паперкі шамацелі,
Нібы асенні ліст...
А ў гэты час дзівосны
Паказваў піяніст.

Спявалі ў зале рэкі,
Вырасталі бары,
Успыхвалі маланкі
Над вежамі ўгары.

Цікава, што пачулі
Тры хлопцы-ласуны?
Ім сніліся, напэўна,
Цукерачныя сны?

Паперкі шамацелі,
Танчэлі ледзянцы...
Аднойчы на канцэрце
Сядзелі малайцы.

Давайце іх навучым
Знайсці музычны слых,
Каб шанаваць суседзяў,
Ды і сябе саміх!

„Лялькі" з Рыбалаў

Лялечны тэатр з Рыбалаў — з'ява ў нашым асяроддзі. Зараз цяжка ўявіць школьны агляд без гэтага жанру і, вядома, без дзетак з Рыбалаў.

У час сёлетняга агляду самадзейнікі з Рыбалаў паставілі п'есу паводле беларускай народнай казкі „Піліпка-сынок". У ролі незвычайнага Піліпкі выступіў Крыстыян Бурнос. Хлопчык ад гадоў прадстаўляе свой тэатральны гурток і вёску. Наогул удзельнікі тэатральнага гуртка, які вядзе Лідзія Мартынюк, уражваюць ангажаванасцю ў справу. Разам выконваюць сцэнічнае афармленне і лялькі. Гэта рэквізіты казачнай прыгажосці.

Сцэнічнае афармленне вельмі ўдала спалучылася з музыкай, якая завастрыла клімат фантастычна-жахлівай казкі. Праўда, час ад часу яна заглушала словы акцёраў. Затое публіка магла палюбавацца прыгажосцю і арнаментыкай сцэны.

Традыцыяй з'яўляецца і тое, што кожны раз самадзейнікі з Рыбалаў заваёўваюць першыя месцы. Варта адзначыць і яшчэ адзін феномен. Лялечны тэатр працуе пры вясковым клубе, а яго кіраўнічка і рэжысёрка Лідзія Мартынюк умее раскрыць добрае і прыгожае ў дзіцяці.

ЗОРКА

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Лялечны тэатр з Рыбалаў паказаў казку „Піліпка-сынок"

Ніна Мацяш

На рэчцы

Дзе промні
ступачкі гарачыя
Халодзяць мяккаю вадой,
Стракозы
з беленькіх гарлачыкаў
П'юць белы-белы сырадой.

Ліскін клопат

Ходзіць ліска па лужку,
Збірае лісіную асаку,
Хоча сплесці з яе рагожку,
Каб малым лісяняткам,
Забягаючы ў хатку,
Было аб што выцерці ножкі.

Казка пра цудоўнага сына

Селі тры сястры ў Піліпаўскі пост ды пралі. Адна кажа:

— Я буду ткачыхай.

Другая:

— Я кухаркай.

Трэцяя ўсміхнулася:

— А я выйду за караля замуж і сына валадару нараджу.

Пачуў пра тры сёстры кароль, прыязджае ў двор.

— Дык ты будзеш маёй жонкай? — пытае наймалодшую.

— Буду.

Паехаў кароль з наймалодшай сястрой у палац, а дзве ў хаце асталіся. Пакрыўдзіліся на лёс. На сястру-каралеву, што іх пакінула ды на ўсё астатняе — на людзей, на свет.

Успыхнула вайна, пайшоў кароль ваяваць. Каралева сына нарадзіла, першынца. Яснага як сонца, прыгожага. Піша яна ліст мужу, пра шчасце гаворыць. Ліст праз ганца каралю пасылае.

— Па дарозе наведай сястрычак, навіну ім перадай, — кажа ганцу на развітанне.

Як даведаліся сёстры пра сына, яшчэ больш зазлавалі. Напаілі яны ганца і ліст падмянілі. Каралю напісалі, што ў яго інвалід нарадзіўся — з капытамі, з адным вокам. Ці гадаваць яго, ці мо ўтапіць?

Прачытаў ліст кароль, заплакаў.

— Гадуй дзіцятка, яно ж невінаватае, — адпісаў. — Як вярнуся, калыхаць буду.

У зваротнай дарозе ганец зноў да сястрыц завітаў. Надта ж спадабалася яму гасціна ў двары. Зноў напаілі яго, зноў ліст падмянілі. Цяпер загадалі, каб сястра ўтапілася разам са сваёй пачварай.

Каралева прачытала ліст, абамлела. Яна не ведала як далей жыць, што думаць.

Загадала слугам падрыхтаваць чаўно, легла з сынком у сярэдзіну і паплыла. Хай не будзе мяне, хай не будзе сынка, — заплакала

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Лукаш

Рэпертуар у конкурсе „Роднае слова” часта паўтараецца. Самыя папулярныя і любімыя аўтары гэта: Вольскі, Дзеружынскі, Швед... Бывае, што на тым жа самым аглядзе прагучыць пяць або і больш вершаў аднаго з названых паэтаў.

Амаль кожны год прысутнічае жартаўліва-адукацыйны верш Міхася Пазнякова „Міколкавы пытанні”.

У гэты раз „Міколкавы пытанні” ставіў Лукаш Сахарчук — вучань Пачатковай школы н-р 6 у Гайнаўцы.

Лукаш спадабаўся не толькі за выкананне, але і элегантнасць.

Зорка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Караль

Цэнтральны, раённы ці школьны агляд дэкламатарскай творчасці — гэта не толькі свята слова. Гэта нагода для цікавых знаёмстваў. Як правіла, амаль усе вучні святочна і прыгожа апрануты, аднак найбольш элегантныя хлопцы — у касцюме, пад гальштукам!

Караль Грыгарук з Пачатковай школы ў Кленіках элегантна прадстаўляў не толькі мужчынскі род, але і сваю школу. У яго выкананні публіка выслухала адзін з шэдэўраў беларускай дзіцячай літаратуры — „Жывую граматыку” Артура Вольскага. Гэты твор найчасцей выбіраюць хлопцы. Чаму? Відаць, ідзе пра дынамічны рытм верша і вясёлы змест.

Зорка

Вершы Віктара Шведа

Хто гэта выдумаў мыццё?

Мама сварыць свайго Лёню:
— Ты лянівы, мой сынок!
Не памыўся ты сягоння,
Бруд відаць ужо здалёк.

— Той, што выдумаў міжволі
Нам штодзённае мыццё,
Ён, відаць, не быў ніколі
У жыцці сваім дзіцём.

Хлус

Хлус сядзеў на драўляным мосце над падрэчкам, глядзеў у ваду і думаў, што тут яшчэ схлусіць. І, перш за ўсё, каму. Сябры і настаўнікі паехалі на канікулы, дзедка і бабуля — у полі, мама з сястрой у санаторыі, тата на працы... Суседзі таксама разышліся кожны па сваёй рабоце, вядома — лета ў вёсцы, некаторыя падаліся ў лес па ягады. І, папраўдзе, ніхто не хоча слухаць Хлусавай хлусні. Нават калі кажа праўду, усе думаюць, што Хлус маніць. А Хлус хлусіць не дзеля таго, каб увесці кагосьці ў зман і ад гэтага мець карысць. Гэта толькі мастацтва, прынамсі так думае, калі схлусіць і цешыцца з таго, што хтосьці яму паверыў. У школе, напрыклад, цікава і пакручаста тлумачыцца са свайго спазнення на ўрок. Вось, ратаваў якуюсь бабульку з-пад колаў аўтамабіля, пасля правёў яе дахаты, супакойваў... А, папраўдзе, заглядзеўся на сям'ю соек, што сварыліся на плоце. Альбо з хаты ў школу выбіраўся бы тая сойка за мора. Вучням, якія прыехалі на школьным аўтобусе, трэба было выбірацца ў школу, бывае, зацямна, а яму ісці паўкіламетра, ледзь вёску прабегчы, а прыходзіць у клас апошнім. Праўда, ягоныя тлумачэнні і іншыя выдумкі гэта ўжо як школьны фальклор, увайшоў у збор анекдотаў, якія паўтараюць вучні і настаўнікі ў настаўніцкім пакоі, але ніхто хлопца не трактуе сур'ёзна, і нават імя быццам бы забылі, жыве ён у школе ды вёсцы як Хлус.

Сядзеў Валік-Хлус, глядзеў у ваду, круціў у руках мабільны тэлефон, які пакінула мама. Побач цярпліва чакала Аста, чорная сучачка. Урэшце абодвум ім абрыдла сядзець на мосце.

— Пойдзем на луг, Аста, — сказаў Хлус сучцы, але нават і яна яму не паверыла. Але ў гэты раз сышлі на лугавую дарогу, выезджаную фурамі з сенам, крыху падмоклую. Рушылі ў бок лесу. Раптам Аста зацяўкала, быццам счула звяра.

Гэта не быў звер. На траве, каля перакуленага кошыка з ягадамі ляжала цётка Насця, пажылая Валікава суседка. Бабуля цяжка дыхала, аблітая халодным потам.

— Ой, сыночку, блага мне стала, — заенчала. — Нага падвярнулася, здаецца, паламала. І сэрца хапіла...

— У мяне ёсць тэлефон, выклічу скорую дапамогу, — Валік памог аперціся жанчыне аб дрэва, набраў нумар.

— Не хлусіш? — азвалася ў трубцы дыспетчарка. — Нядаўна жуллё вызвала карэтку, а гэта толькі жарт быў! Уяўляеш?! Хтосьці, можа, канае, а вас трымаюцца такія жахлівыя жарты! Скуль звоніш? З луга? Выдумай яшчэ што! Адкуль у цябе тэлефон? Мамін мабільнік!? — дзяжурная кінула трубку.

Валік расплакаўся. Пазваніў яшчэ раз. Баба Насця абсунулася пад бярозай — зрабілася ёй яшчэ горш.

— Хай гаворыць тая жанчына, — дзяжурная і слухаць не хацела Валіка.

— Яна страціла прытомнасць! У яе твар пакрывіла, не можа гаварыць... Такая гарачыня... Божа, прыязджайце, цётка Насця памірае! — Хлус калаціўся ад страху.

Праз паўгадзіны па шашы мчалася карэтка скорай дапамогі, завярнула на луг. Заплаканы Хлус махаў белай хусткай бабы Насці над яе бледным тварам.

Міра Лукша

Польска-беларуская крыжаванка № 33

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 29: Букет, мара, пасуда, Алах, ансамбль, быт, альт, атава, абрус, кана, курапатка. Баабаб, вусны, куст, ура, тамат, блакіт, мальва, альтанка, Юра, ахова, ар.

Узнагароду, **запісную кніжку**, выйграў **Пётр Герасімюк** з Арэшкава. Віншуем!

Фота ВІКТАРА БУРЫ

Фэст адкрылі (злева): старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі, войт Міхалоўскай гміны Марк Назарка і загадчык Эксплуатацыі Семяноўскага вадасховішча Лявон Хлябіч

Фота ВІКТАРА БУРЫ

Ансамбль народнай песні „Бераставіцкія музыкі" (другая справа — Марыя Юшкевіч)

Свята душы

Лета — час традыцыйных беларускіх фэстаў. 26 ліпеня г.г. усе дарогі вялі ў Бандары. На працягу больш 4 гадзін чуваць было тут беларускія песні. А 17-й гадзіне мерапрыемства на роднай беларускай мове адкрылі войт Міхалоўскай гміны Марк Назарка, старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі і загадчык Эксплуатацыі Семяноўскага вадасховішча Лявон Хлябіч. Затым на сцэну ў народным уборы выйшла сакратар ГП БГКТ Валянціна Ласкевіч, якая павяла канцэрт.

Першай на эстраду выйшла дырэктар Бераставіцкага раённага метадычнага цэнтра па народнай творчасці Марыя Юшкевіч, заадно кіраўнік ансамбля народнай песні „Бераставіцкія музыкі". Калектыў быў заснаваны ў 1990 г., а сем гадоў пазней прысвоена яму званне народнага. Калектыў многа разоў выступаў у Польшчы, у тым ліку і на Беласточчыне. „Бераставіцкія музыкі" — лаўрэат Усебеларускага фестывалю „Беларусь — мая песня" ў 2000 г. і II фестывалю ў Аўцюках. Калектыў складаюць 5 салістаў і 5 інструменталістаў (скрыпка, баян, акардэон, барабан, кантрабас і іншыя). У рэпертуары калектыву народныя песні — беларускія, украінскія, польскія і іншых народаў.

Побач „Бераставіцкіх музыкаў" выступілі нашы калектывы — „Лідэр" з Беластока, „Расспяваны Гарадок" з Гарадка, „Гэвэн" з Гайнаўкі, „Сакрэт" з Масквічка. — Абавязкова трэба працягваць гэту традыцыю. Вялікую справу робіць Беларускае таварыства, вялікае ім дзякуй за гэта". Дзякуй Вам, Галя Іванаўна, за шчырыя, задушэўныя словы!

Беларускі фэст прайшоў па поўнай праграме. Пасля афіцыйнай часткі і выступленняў самадзейнікаў адбылося традыцыйнае застолле з музыкай і песнямі на беразе Семяноўскага вадасховішча пад светлым месяцам ля былой вёскі Рудня. Там усе калектывы сустрэліся як добрыя знаёмыя.

Вялікую дапамогу ў наладжанні фэсту аказалі Анна Марыя Дабравольская з Гміннага асяродка культуры, спорту і адпачынку, а таксама Марыян Гайдучэня — каардынатар па справах спорту, які перад канцэртам сарганізаваў спартыўныя спаборніцтвы і конкурсы.

Тое, што ў Бандарах штогод адбываецца народны фэст, гэта заслуга мясцовых грамадскіх дзеячаў. У іх ліку Лявон Хлябіч, Раман Ляткоўскі, Мірaслаў Багнюк, Уладзімір Павільч, Ян Хлябіч, Ян Бура, Мірaслаў Андраюк, Канстанцін Новік, Ірына і Славамір Матвеюкі, якіх узначальвае дзелавітая спадарыня солтыс Ніна Лукша. Дзякуючы такім людзям свята ў Бандарах аб'ядноўвае мясцовых беларусаў, прыцягвае да мерапрыемства жыхароў навакольных вёсак.

Віктар Бура

Фота ВІКТАРА БУРЫ

Бандарская публіка

Віншаванне Майсеню Канстанціну Мікалаевічу

Вельмі паважаны спадар Майсеня — сардэчна віншуем Вас з выдатным 80-гадовым юбілеем. Вашай шматгадовай плённай працай зроблены адметны і важкі ўнёсак у станаўленне і развіццё беларускага грамадскага руху на Беласточчыне. У многім дзякуючы Вашай ініцыятыве, цвёрдай упэўненасці ў поспех задуманага, няспынным арганізацыйным намаганням і творчай думцы створаны Музей і цэнтр беларускай культуры, якія ўжо сталі важнымі фактарамі захавання набыткаў і далейшай падтрымкі беларускай нацыянальнай культуры, традыцыі і народнай творчасці. Жадаем Вам, дарагі Канстанцін Мікалаевіч, добрага здароўя і доўгіх гадоў жыцця.

З глыбокай пашанай
Грамадскі камітэт пабудовы Музея і цэнтра беларускай культуры ў Гайнаўцы і Рэвізійная камісія

Чаромхаўскія польска-ўкраінскія сустрэчы

3 жніўня ў Чаромсе праходзілі пятыя Польска-ўкраінскія сустрэчы. Арганізатарам мерапрыемства былі Саюз украінцаў Падляшша і Гмінны асяродак культуры. Імпрэза была арганізавана з вялікай помпай. Надвор'е не падвяло, публіка таксама. Гандляроў і купцоў з'ехалася процьма. Асноўны спонсар, піваварны завод „Ломжа" заняў шмат месца для сваіх ларкоў з півам.

Мерапрыемства прайшло ўдала, хаця канцэрт пачаўся з невялічкім спазненнем. Выступалі чаромхаўскія самадзейнікі (дзіцячы калектыў „Гілочка", музычны „Авэрс", „Чарамшына"), „Ранок" і „Ярд" з Бельска-Падляшскага ды госці з Украіны, з горада Роўнае. Многія песні былі вядомымі чаромхаўскай публіцы. Канцэрт асабліва спадабаўся моладзі, якая гуляла на пляцоўцы побач сцэны. А танцы працягваліся да раніцы. Начное рэха далёка за поўнач нясло звонкую музыку ў адлеглую за 2 км Кузаву. Чарамшане вясёла і культурна правялі час, за што належацца словы падзякі арганізатарам мерапрыемства.

Уладзімір Сідарук

Музычныя нядзелі

У час канікулаў у Гайнаўцы арганізаваны былі „музычныя нядзелі", у час якіх выступалі калектывы з Гайнаўскага павета і іншых мясцовасцей Падляшскага ваяводства. Мерапрыемствы наладжаны былі Гайнаўскім домам культуры з фінансавай падтрымкай гарадскога бюджэту. Адбываліся яны перад магістратам і адрасаваны былі моладзі і старэйшай публіцы. 27 ліпеня з канцэртам выступілі музычна-інструментальны калектыў „Гадэк" з Гайнаўкі і два калектывы з Беластока. Зацікаўленне канцэртам было невялікае. Публікі было намнога менш, чым у час беларускага фэсту. (ам-з)

Родам з Беласточчыны

Мікола Дзямідаў

Пра дзеяча беларускага нацыянальнага руху, палітыка і вайскоўца Міколу Дзямідава напісана ў Беларусі вельмі мала. Яго дзейнасць, як вайскоўца, лепш за ўсё пададзена ў кнізе Алега Латышонка „Białoruskie formacje wojskowe 1917-1923" (Беласток, 1995 г.). Паводле Алега Латышонка, у названы перыяд у беларускім друку з'яўляліся невялікія энцыклапедычныя згадкі пра Міколу Дзямідава і яго сяброў па барацьбе за незалежнасць Бацькаўшчыны. Праўда, напісаны яны сціпла і па-рознаму суб'ектыўна. Хаця сам Мікола Дзямідаў у гісторыі Беларусі заслугоўвае саліднай манаграфіі.

Нарадзіўся ён у сям'і Станіслава Катнароўскага і Алесі Каліноўскай 10 снежня 1888 года ў Ломжы. Бацька рана памёр і маці аўдавеўшы, выйшла замуж за Янку Дзямідава. Айчым усынавіў пасынка і надаў яму сваё прозвішча. Але выхоўвалі хлопчыка ў асноўным дзядуля і бабуля па маці.

У 1905 годзе Мікола Дзямідаў здае паспяхова экзамены на настаўніка пачатковай школы пры Свіслацкай настаўніцкай семінарыі. А за год да паступлення ў семінарыю закончыў Ломжынскую філалагічную мужчынскую гімназію. Працаваў на чыгунцы, пасля настаўнікам пачатковых класаў. Але з вучобаю не развітаўся. У 1910 годзе паспяхова скончыў Беластоцкае рэальнае сярэдняе вучылішча, быў вольным слухачом Варшаўскага універсітэта.

18 ліпеня 1914 года Міколу Дзямідава прызываюць у расійскае войска, дзе ён уладкоўваецца справаводам гаспадарчай часткі розных ваенных падраздзяленняў. Але і тут ён умудраецца вучыцца. Спачатку наведвае курсы пры Мікалаеўскай ваеннай акадэміі ў Пецярбургу, а пасля заканчвае ў горадзе на Няве Паўлаўскае ваеннае вучылішча.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі ў Петраградзе, Мікола Дзямідаў уваходзіць у Хаўрус афіцэраў-рэвалюцыянераў, прызначаецца абласным камісарам у Ноўгарадзе. У сакавіку 1918 года трапляе ў нямецкі палон, яго змяшчаюць у лагер для палонных вайскоўцаў. Пасля капітуляцыі Германіі наш зямляк выходзіць на волю і ў лістападзе 1918 года пераязджае ў Вільню, дзе далучаецца да стварэння беларускага нацыянальнага войска.

20 снежня 1918 года з часцямі арміі генерала Кандратовіча Мікола Дзямідаў займае Гародню і прызначаецца камендантам горада і начальнікам Гарадзенскай ваеннай акругі, куды ўваходзілі крэпасць і 16 фартоў. У гэты час у Гародні працуе Урад БНР і Гародня становіцца часовай сталіцай Беларусі. Сюды прыязджаюць для перамоў амерыканскія, англійскія і французскія місіі. У Гародні ў той час быў парадак і спакой, а ў беларускім войску — узорная дысцыпліна.

1 чэрвеня 1919 г., падчас раззбраення Першага Беларускага палка, Мікола Дзямідаў быў арыштаваны палякамі ды інтэрнаваны ў беластоцкім лагеры „Станцыя Раздольная". Вызвалілі яго толькі праз год. Пасля вызвалення Дзямідаў паступае ў распараджэнне Варшаўскай беларускай вайсковай школы падхаронжых. А ў сярэдзіне 1920 года далучаецца да аддзелаў генерала Станіслава Булак-Балаховіча, які прызначае Дзямідава начальнікам штаба Беларускай Першай брыгады. А 20 кастрычніка 1920 года той жа генерал Булак-Балаховіч прызначае Дзямідава кіраўніком усіх Беларускіх Узброеных сіл, якія знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі. У падпарадкаванне Дзямідава ўвайшлі Першы Менскі пяхотны полк (камандзір маёр А. Яцэвіч), Другі Менскі пяхотны полк (камандзір палкоўнік Гершэльман), Першы Беларускі гусарскі полк пад камандаваннем палкоўніка Бянецкага, чатыры сотні Зялёнадубцаў, шэсць соцень вайскоўцаў з Дзікай дывізіі, казачы атрад Віктара Савянкова, Гарадзенскі батальён, артаддзел палкоўніка Талат-Келпша, аддзел коннай разведкі прапаршчыка Баркова...

У 1922 годзе Мікола Дзямідаў па Беластоцкай акрузе становіцца паслом польскага Сейма, а праз год палякі яго з іншымі беларускімі дзеячамі высялюць з Заходняй Беларусі.

Наш зямляк пераехаў у Дзвінск, дзе разам з Кастусём Езавітавым працаваў у розных беларускіх грамадска-культурных арганізацыях, актыўна ўдзельнічаў у беларускім культурным жыцці Латвіі, арганізаваў там беларускія школы. І здавалася, што ўсё будзе добра, калі б не прыход у Латвію бальшавікоў у 1940 годзе. Яны арыштоўваюць Дзямідава і перавозяць яго ў Маскву на Лубянку. Праўда, праз год яму ўдаецца адтуль вызваліцца і вярнуцца зноў у Дзвінск.

У сярэдзіне вайны Мікола Дзямідаў пераязджае ў Ліду, дзе працуе акруговым школьным інспектарам. Ён арганізуе настаўніцкія курсы, а кіраўніком іх прызначае Алеся Яцэвіча. А сам адначасова арганізоўвае беларускі батальён самааховы, куды ўваходзілі ў асноўным настаўнікі. Батальён самааховы адмовіўся ад прысланай немцамі паліцэйскай чорнай формы, а праз некаторы час атрымаў іншую форму з беларускай сімволікай...

З восені 1944 года генерал-маёр Мікола Дзямідаў жыў на эміграцыі. Спачатку ў французскай зоне ў Германіі, дзе быў адным з ініцыятараў узнаўлення Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы, а пасля ў ЗША. Пасяліўшыся ў 1950 годзе ў Чыкага, Мікола Дзямідаў шчыра сябраваў з Язэпам Варонкам і Алесем Змагаром. Ён далучыўся да Згуртавання беларусаў штата Ілінойс, дзе прымаў актыўны ўдзел у грамадска-палітычным і рэлігійным жыцці беларусаў.

Памёр Мікола Дзямідаў 23 чэрвеня 1967 года на 77-м годзе жыцця ў Чыкага, дзе і пахаваны.

Сяргей Чыгрын

Фота КРЫСТЫНЫ КАСЦЕВІЧ

Дзеткі, якія сёлета адпачывалі пры Свята-Троіцкім саборы, з айцом Міхаілам Негярэвічам, апекунамі і старшынёй Брацтва Янам Андраюком

Гулялі і адпачывалі

Гайнаўскае аддзяленне Праваслаўнага брацтва св. св. Кірылы і Мяфодзія, якое дзейнічае пры Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы, у час сёлетніх канікулаў пяты раз арганізавала адпачынак для дзяцей.

Звыш трыццаці дзетак сустракаліся ў памяшканні распаложаным каля царквы, гулялі там і адпачывалі. У Гайнаўскім доме культуры былі арганізаваны мастацкія, музычныя і танцавальныя заняткі. Вучні купаліся ў басейне насупраць царквы і гулялі на спартыўнай пляцоўцы. Дзеці ездзілі і хадзілі на экскурсіі. Найбольш ім спадабалася экскурсія ў вайсковую часць у Нязнаным Бары. Пасля азнаямлення з вайсковымі аб'ектамі вучні адпачывалі пры вогнішчы.

Штодзень заняткі распачыналіся ад малітвы і кароткіх духоўных размоў аб выхаваўчых праблемах. Усе дзеткі елі снеданне, абед і падвячорак. На заканчэнне адпачынку вучні атрымалі дыпломы, падарункі і ўзнагароды за ўдзел у конкурсах.

— Памятайце пра адпачынак арганізаваны ў нас і ў будучым таксама памагайце дзецям, — заклікаў намеснік сабора, мітрафорны протаіерэй Міхаіл Негярэвіч.

У мінулых гадах на арганізаванне адпачынку для вучняў пры саборы было выдзелена больш грошай. У гэтым годзе сродкаў Камісіі вырашання алкагольных праблемаў не хапіла. Арганізатары шукалі спонсараў і даклалі да мерапрыемства ўласныя сродкі.

Аляксей Мароз

Нарва

Інтэрнэт у бібліятэцы

Публічная бібліятэка ў Нарве існуе больш за 40 гадоў. Мне яна памятаецца з 1962 і 1963 года (тады я настаўнічаў у тамашняй сямігадовай пачатковай школе). У бібліятэцы заўсёды было ўтульна і прыемна.

Вельмі шкада, што той вялікі двухпавярховы драўляны будынак (на першым паверху яго была кіназала і дэманстраваліся фільмы) згарэў датла, а з ім і ўвесь даволі багаты бібліятэчны кнігазбор. Бібліятэку нанава адкрылі ў 1973 годзе. Некалькі гадоў пераводзілі яе з аднаго памяшкання ў другое. Пастаяннага месца яна не мела да часу, калі пабудавалі пажарнае дэпо па галоўнай вуліцы. У ім і зараз знаходзіцца Гмінная публічная бібліятэка (ГПБ).

У ГПБ цяпер 10 717 тамоў, у тым ліку 209 беларускіх кніжак (у 2001 годзе было 583). У гэтым годзе купілі 300 кніжак — перш за ўсё мастацкай і папулярна-навуковай літаратуры. У бібліятэку падарылі яшчэ кніжкі Навуковае выдавецтва „Сэмпэр" з Варшавы, Беларускае літаратурнае аб'яднанне „Белавежа" з Беластока, а таксама індывідуальныя ахвяравальнікі, м.інш. Ангеліна Машынская і Валянцін Галіцкі з Нарвы ды Анэта Анхімюк з Крыўца.

Мае яна 302 верных чытачоў (у мінулым годзе — 271). Чытачы ахвотна карыстаюцца бібліятэчнымі газетамі і часопісамі (тут іх 20), у тым ліку „Ніва" ды „Часопіс". Бяруць іх да чытання таксама дадому.

У ГПБ працуюць Анна Анджэюк-Савіцкая (кіраўнічка бібліятэкі) і Ала Сяткоўская. У гміне дзейнічаюць дзве філіі ГПБ: у Ласінцы (тут працуе Крыстына Келбашэўская) і ў Трасцянцы (Іаанна Шафранская). З малодшымі дзяцьмі найбольш займаецца Іаанна Шафранская і са старэйшымі — Ева Алімоўская (тэатральная інструктарка Нарваўскага асяродка культуры). І зараз у бібліятэках пануе прыемная атмасфера.

Беларускія кніжкі і „Ніву" чытаюць перш-наперш студэнты беларускага філфака, ліцэісты з Бельска і Гайнаўкі, а таксама старэйшыя асобы, якія ведаюць беларускую мову.

Варта адзначыць, што ад нядаўна ў ГПБ карыстаюцца камп'ютэрам. А ўжо ў верасні г.г. чытачы будуць мелі магчымасць карыстацца Інтэрнэтам.

Янка Целушэцкі

Столяр што калаўроты рабіў

Лёва Багінскі з Галадоў Бельскай гміны першы на ўсю ваколіцу пачаў карыстацца возам на гумавых шынах. Зрабіў ён воз уласнаручна ў 1957 г. Ягоны бацька Навум пры санацыі выпрабляў драўляныя колы для вазоў-жалезнякоў. Лёва пасля вайны рабіў калаўроты, а затым стаў столярам.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

— Пры санацыі я сем гадоў хадзіў у школу, але навука была такая, што пасля заканчэння першага і другога класаў трэба было два гады вучыцца ў трэцім і тры ў чацвёртым класах, нягледзячы на вынікі вучобы, — успамінае Лёва Багінскі. — Калі пачалася нямецка-польская вайна ў 1939 г. мне было 13 гадоў. Пры саветах школа была ў Бельску і ад нас вучыліся ў ёй толькі тыя, хто меў станцыю, або сваякоў у горадзе. У Галадах стаялі савецкія камандзіры і яны пасылалі сваіх дачок у Бельск вучыцца. Пры немцах сваяк узяў мяне на работу пры аднаўленні спаленага маста на рацэ Арлянцы.

Пасля вайны з частак пакінутага салдатамі савецкага матацыкла зрабіў я такарны станок. У недакончанай частцы дома (пачаў яго будаваць бацька ў 1935 г.) зрабіў я майстэрню. Працаваў я на гаспадарцы, але паколькі бацькі былі слабога здароўя, у войска мяне не бралі. У 1953 г. я ажаніўся і тады мяне перавялі ў запас і ўзялі на абучэнне ў Сувалкі. Пасля працаваў я столярам у дзяржаўным прадпрыемстве ГОМ у Бельску.

Мы з бацькам выконвалі драўляныя ўпрыгожанні дамоў, вокан, ганкаў. Пасля заканчэння палявых работ пачынаўся ў нас сезон вытворчасці калаўротаў. Для гэтай справы выкарыстоўвалі мы лісцевую драўніну: мяккую і лёгкую ліпу ды альшыну і цвёрдую бярозу. Самы галоўны элемент — кола. Трэба было спачатку склеіць дошкі, выразаць кола, уставіць спіцы і апрацаваць на такарным станку. Пры санацыі рабілі калаўроты з вялікімі коламі, г.зв. французскія. Вялікае кола хутчэй вярцела шпулькай і паскорвала рытм прадзення. Пры вырабе калаўротаў патрэбны канструктарскія ўмеласці. Старанна выкананне кола мела істотны ўплыў на працу ўсёй прылады, якая служыла прадзільшчыцы дзесяткі гадоў. Толькі клеенае кола пад уплывам вільгаці расклейвалася і час ад часу патрабавала рамонту.

Калаўроты прадаваліся з восені да Каляд. Кліенты або самі прыязджалі купіць прыладу, або мы ездзілі прадаваць іх на рынак. Калі калаўроты сталі выходзіць з агульнага ўжытку, тады я заняўся будаўнічай сталяркай. Можа і далей рабіў бы я калаўроты, але ў 1969 г. перад Калядамі згарэла клуня з прыбудоўкай, у якой знаходзіўся такарны станок.

Часам нехта пытае пра калаўроты для дэкаратыўных мэт, шукаюць іх таксама збіральнікі прадметаў народнага мастацтва.

Запісаў Міхал Мінцэвіч

Спачатку паказваліся дзеці

Успаміны Рыгора РАМАНІКА, жыхара Ласінян, народжанага ў 1915 годзе.

Калі ў 1944 годзе прайшоў фронт, наша вёска асталася ў межах Савецкага Саюза, бо людзей на вайну трэба было браць. Паклікалі нас у Бераставіцу, у ваенкамат. З Бераставіцы адправілі пехатою ў Мінск, бо чыгунка сарваная была. У Мінску апранулі ў шынелі і каго прызначылі ў пяхоту, таго адразу адпраўлялі на Берлін. А я трапіў у сувязісты і нас у Мінску абучвалі. Пасля абучэння павезлі нас поездам праз Украіну, Румынію і Югаславію на фронт; я быў пры гармаце за пяхотаю.

Як мы наступалі, то людзі ўцякалі перад фронтам, а калі ўжо занялі якую мясцовасць, то спачатку дзеці паказваліся, а за імі дарослыя. Нас аснасцілі слоўнікамі і мы так крыху дагаворваліся з жыхарамі займаных краін. Паказвалі на які прадмет і пыталі, як гэта называецца.

Браў удзел у баях за Будапешт, Вену і Прагу. Гаварылі:

— Як зайшоў за Дунай, то дадому не думай!

Кармілі нас добра, але калі разбілі кухню, то трэба было самому шукаць ежы. І зважаць, каб не патручана была.

Дайшоў аж у Германію, там вайна скончылася. Усе немцы клалі ружжо ў горбу. А куды пасля тое ружжо забралі, невядома.

Я праслужыў цэлы год, аж мой *рочнік* адпусцілі. Везлі поездам назад праз Ясы, Кішынёў, Украіну; прыехаў аж у Бераставіцу.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

Гайнаўка

Самі сабе

У Гайнаўцы арганізавалі Дабрачыннае таварыства „Самі сабе". Ініцыятыва ўзнікнення яго выйшла ад працаўнікоў тамашняга Гарадскога асяродка сацыяльнай дапамогі. У цяперашні час арганізаванне такога Таварыства стала неабходнасцю. Таму ўзнікаюць розныя фундацыі і няўрадавыя арганізацыі. Мэта Таварыства „Самі сабе" — дабрачынная дзейнасць у карысць састарэлых адзінокіх людзей, дзяцей і моладзі з фізічнымі заганамі ды беспрацоўных. Новавыбраныя ўлады Таварыства будуць здабываць грошы ды розныя рэчы і прадметы, між іншым, ад краёвых і замежных арганізацый, ад фізічных і юрыдычных асоб. Яны плануюць адкрываць сталоўкі для беднякоў.

Старшынёю Дабрачыннага таварыства „Самі сабе" выбралі Міраслава Аўксенцюка, намеснікам старшыні — Барбару Васілюк і сакратаром — Барбару Грабяк.

(яц)

Ніколі не падала духам

Анастасія, найстарэйшая дачка Арцёма Чыквіна, нарадзілася 17 лістапада 1922 года. У міжваенны цяжкі час нашым людзям жылося нясоладка, аднак Арцём неяк зводзіў кацы з канцамі; мала таго: ён першы ў вёсцы купіў радыёприёмнік на навушнікі і быў выдатным пчаляром. Быў гаспадаром, як кажуць, з галавою і ягоная сям'я, хаця немалая, ніколі голаду не адчувала, хаця жыла скромна. Пасля Арцём адкрыў і сваю краму, дзе можна было купіць амаль усё, як кажуць: ад іголкі да больш канкрэтных рэчаў. Быў ён чалавекам адукаваным і пры саветах настаўнічаў у Грабаўцы і грабаўляне сёння цёпла ўспамінаюць свайго настаўніка. Калі 22 чэрвеня 1941 года ўспыхнула вайна між Савецкім Саюзам і фашысцкай Германіяй, Арцём Чыквін, як і большасць нашых людзей, балюча гэта перажываў. Калі немцы пачалі вывозіць нашу моладзь на прымусовыя работы ў Германію, не мінавалі і сям'і Арцёма. У пачатку лютага 1942 года Анастасію, разам з іншымі вяскоўцамі, адправілі ў Прусію. Дзмітры Хіліманюк, хросны бацька Анастасіі, завёз іх фурманкаю ў Бельск-Падляшскі; Арцём таксама ехаў з Дзмітрым на развітанне з любімай дачкою. Там немцы загналі падняволных у хлеўчык і на другі дзень павезлі таварным поездам у невядомае. Насця мела з сабою самаробны чамаданчык, (бацька быў і выдатным сталяром), у якім былі хлеб і сала, пакладзеныя маці Вольгай.

Праз Беласток завезлі іх у горад Вормдыт, 20 кіламетраў ад Кёнігсберга. Насцю з тамашняга арбайтсамта забрала маладая немка і яны пайшлі вуліцамі таго гарадка. Немка заўважыла, што Насці цяжка несці чамаданчык з салам і хлебам, узяла яго ад яе і таксама несла; прадчувалася, што гэта добрая жанчына. Завяла яна Насцю ў свой вялікі і прыгожы дом у цэнтры горада з агародам, абгароджаны харошым плотам. Па-суседску быў тартак, у якім працавалі рускія ваеннапалонныя, якія нейкім тонкім прадчуваннем палічылі яе сваёй, бо пры кожнай нагодзе віталі яе словамі „Здравствуйте".

У гэтай ветлівай і культурнай гаспадыні было чацвёра малых дзяцей. Муж быў намнога старэйшы за яе і быў без аднаго вока, якое страціў у час першай сусветнай вайны. Хадзіў ён у ваеннай форме і займаўся абучэннем салдат, якіх пасля адпраўлялі на ўсходні фронт; гаспадар займаўся гэтым не толькі ў сваім горадзе, але ездзіў яшчэ і ў суседнія Кёнігсберг і Пронцберг. Гаспадары былі добрымі людзьмі, Насця ніколі не пачула ад іх дрэннага слова, яны і да рускіх палонных адносіліся з павагай, хаця вялі вайну з іх дзяржавай. Гаспадыня мела падвойнае імя Лота Марыя, а гаспадар называўся Эган Вэрнэ.

Насця цэлы час працавала ў агародзе побач дома, сваю працу выконвала акуратна і немцам гэта вельмі падабалася, бо ставілі яе ў прыклад іншым, нават немцам. Яна не цуралася і іншых работ, якіх не бракавала. У гаспадароў працавала яшчэ служанка, немка, якая некалькі разоў хацела пасварыць іх з Насцяй. З купленага дзецям малака яна некалькі разоў збірала адстоеную зверху смятану і з'ядала яе. Калі гаспадары прыкмецілі, што смятана прападае, спыталі іх абедзве, дзе дзяваецца страта. Тая нямецкая служанка сказала, што гэта Насця віноўная, але гаспадары не паверылі ёй і аднойчы прылапалі яе на гарачым учынку, як яна пальцам злізвала смятану з пасуды. Тады гаспадыня тую нямецкую служанку некалькі разоў улупіла па твары. Тая служанка абкрадала таксама Насцю з яе масла і хлеба, якія давалі гаспадары, бо кармілі добра, але Насця цярпела і не скардзілася на яе. Гаспадары і пра гэта ведалі, таму Насцю вельмі шанавалі.

Лота Марыя некалькі разоў забірала Насцю ў кіно. Паказвалі там пераважна фільмы пра рускае жабрацтва, як у СССР людзі галодныя і босыя жывуць і што немцы там установяць парадак і рай. Хаця палонным забаранялася хадзіць у кіно, аднак гаспадыня забірала Насцю на сваё рызыка. Нельга было таксама размаўляць з рускімі палоннымі, што працавалі за плотам у тартаку, аднак Насця часта размаўляла з імі, хаця гаспадар перасцерагаў яе перад гэтым.

Калі з усходу набліжаўся фронт, дык амаль усіх прымусовых работнікаў немцы выслалі для капання абаронных акопаў, але спагадлівыя гаспадары Насцю туды не выслалі, толькі адправілі сваю нямецкую служанку. У палове сакавіка 1945 года гаспадар адправіў сваю сям'ю ў Берлін, дзе жылі бацькі Лоты Марыі; яна горача развіталася з Насцяй. Сам Эган астаўся, бо ён быў камендантам горада. Немцы масава адступалі і ўцякалі на захад. Галодныя былі нават салдаты, бо аднойчы ўзламаліся ў падвал гаспадароў і пазабіралі ўсе банкі з мясам. Калі Насця расказала пра гэта Эгану, які ў той час быў у сваім бюро, ён толькі заўважыў: „Нічога не зробіш, гэта вайна".

15 сакавіка Эган Вэрнэ сказаў Насці, што яна ўжо свабодная і можа вяртацца дамоў. Гэта была складаная справа, бо па дарогах перавальваліся натоўпы і нямецкіх салдатаў, і цывільных, і прымусовых работнікаў. І Насцю ўхапіў гэты гаротны натоўп, які суправаджалі бяда, голад ды ўзрывы снарадаў. Так дайшлі да горада Эльбланг і недзе пры канцы сакавіка іх занялі саветы. Да натоўпу звярнуўся савецкі афіцэр з пытаннем, хто згодзіцца варыць у іхняй ваенный часці ежу іхняму палкоўніку. Насця згадзілася адразу і стала даглядаць раненага палкоўніка Папова; так дачакала яна канца вайны. Палкоўнік, які палюбіў яе за парадачнасць і добрасардэчнасць, хацеў забраць яе з сабою ў Кёнігсберг, але яна рашыла вяртацца дамоў. Пайшла ў польскае прадстаўніцтва ў Эльблангу і там аформіла дакументы для вяртання. Пабачыла яна тады столькі грабяжоў, як кралася нямецкае дабро, што цяжка пра тое і расказаць.

Насця Чыквін вярнулася дамоў у палове чэрвеня 1945 года, перад Тройцай. І ў тым жа годзе, 17 лістапада, у дзень свайго нараджэння, яна выйшла замуж за Яшку Грыгарука і яны шчасліва жывуць па сённяшні час.

Мікалай Панфілюк

Селянін, што далей?

Аб планах развою вясковай тэрыторыі на працягу першых двух гадоў пасля ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз дыскутавалі ў Беластоку прадстаўнікі падляшскіх самаўрадаўцаў, сялянскіх арганізацый і фірмаў харчовай перапрацоўкі з прадстаўнікамі міністэрства сельскай гаспадаркі.

У сустрэчы прынялі ўдзел работнікі ведамства сельскай гаспадаркі, якія займаюцца структурнымі фондамі ЕС: Мечыслаў Парадоўскі і Магдаліна Навіцкая.

— Атрымаем механізмы для вядзення рэгіянальнай нацыянальнай сельскай гаспадаркі. Мусім умець імі карыстацца, — пераконваў падляшскі віцэ-маршалак Кшыштаф Талвінскі.

Міністэрскія госці прадставілі два праекты, падрыхтаваныя пад вокам нядаўна назначанага міністра сельскай гаспадаркі Войцеха Алейнічака: „План развою вясковай тэрыторыі (2004-2006)" і „Рэструктурызацыя і мадэрнізацыя харчовага сектара (2004-2006)". Згодна з гэтымі прыярытэтнымі мэтамі на вёсцы мае наступіць: паправа канкурэнтаздольнасці сельска-харчовай прадукцыі (м.інш. падтрымка новых вытворчых груп і нізкатаварных гаспадарак) ды ўраўнаважаны развой вясковай тэрыторыі (тут м.інш. павелічэнне лясістасці краіны). Грошы на гэтыя мэты ў 80 прац. атрымаем з Еўрасаюза. Прадбачана таксама ўвядзенне структурных рэнт. Будуць яны накіраваны сялянам дапенсійнага ўзросту (55 гадоў), у якіх гаспадаркі не меншыя за 3 гектары, гатовых перадаць яе на павелічэнне іншай гаспадаркі або маладому наследніку. Умова — вядзенне сельскай дзейнасці найменш 10 гадоў і аплачванне сялянскай страхоўкі найменш 5 гадоў. Прытым кваліфікаваны земляроб, які будзе пераймаць гаспадарку, мусіць абавязацца весці яе не карацей чым 5 гадоў ад моманту калі яе пяройме.

Што самае важнае — узровень структурнай рэнты будзе ўстаноўлены як адпаведны працэнт сумы найменшай пенсіі. Ад сакавіка гэтага года гэта 552,63 зл., а падставовы ўзровень структурнай рэнты гэта 250% яе сумы. Максімальная сума рэнты — 480 працэнт найнізжэйшай пенсіі.

У сваю чаргу, для прыкладу, нізкатаварныя гаспадаркі (з нейкай толькі часткай тавару накіраванага на рынак) могуць разлічваць на падтрымку ў выглядзе гадавой прэміі 1 250 еўра, з магчымасцю сплаціць яе на працягу 5 гадоў. Аднак, пасля 3 гадоў уласнік такое гаспадаркі мусіць паказаць свае дасягненні звязаныя з яе рэструктурызацыяй. Скрываецца за гэтым або атрыманне сертыфіката экалагічнай прадукцыі, або ўваход у вытворчую групу ці арганізацыю, або заканчэнне абучэнняў у галіне добрай земляробчай практыкі або эканомікі сельскай гаспадаркі, або пераход на сістэму падаткавання ПДВ на агульных прынцыпах. Што цікава, такая падтрымка не мусіць быць вернена, нават у выпадку браку рэалізацыі закладзенага плана рэструктурызацыі гаспадаркі.

Адна з мэт, вынікаючых з плана развою вясковай тэрыторыі — аблясенне грунтаў, што трывожыць сялян Падляшскага ваяводства, паколькі датычыць шмат зямлі ў нашым рэгіёне, з нізкай прыдатнасцю для сельскай гаспадаркі. За вылучэнне грунтаў селянін (ці група найменш 5 сялян) атрымае эквівалент, пры ўмове, што будзе ўтрымліваць пасадку 5 гадоў ад насаджэння. Прызначэнне да аблясення праводзіцца будзе паводле мясцовага праставага плана добраўпарадкавання і вызначанай сельска-лясной мяжы або па заяве ўласніка грунтаў на падставе рашэння аб умовах забудовы і добраўпарадкавання тэрыторыі. Мінімальная паверхня аблясення — 0,5 га, а ў выпадку групавай заявы — 5 гектараў. Для аблясення маюць быць скарыстаны толькі віды дрэў і кустоў тутэйшых, адпаведных для месца. Спіс відаў будзе прадстаўлены ў спецыяльнай праграме Міністэрства сельскай гаспадаркі. З сістэмы плацяжу будуць вылучаны выключна святочныя елкі і хуткарослыя дрэвы. Плацеж будзе ўстаноўлены на падставе паверхні грунтаў і выплачваны ў гадавым тэрміне. І так, атрымаць можна будзе:

— 3 400 да 6 200 злотых за гектар, залежна ад віду лесу і вышыні над узроўнем мора;

— 1 800 зл. — за абгараджэнне пасадкі двухметровай сеткай;

— 570 зл. — за іншыя метады захавання ад звярыны;

— 400-520 зл. — прэмія за догляд (5 гадоў ад аблясення; у залежнасці ад вышыні над узроўнем мора);

— 1 000 зл. — аблясенчая прэмія (выплачваная 20 гадоў).

У сваю чаргу, таксама і на падтрымку Еўрасаюза могуць разлічваць сяляне, якія будуць папраўляць умовы прадукці, дастасоўваючы гаспадаркі да стандартаў у галіне аховы асяроддзя, здароўя людзей, жывёл і раслін, бяспекі працы і ўмоў дагляданння жывёл (галоўным чынам справа ў структурным дастасаванні гаспадарак пастаўляючых малако). Такая дапамога гэта гадавая прэмія, выплачваная не больш чым 5 гадоў, паводле меншаючай стаўкі. Ліміт спалучанай падтрымкі, залежнай ад дастасаваўчых прац, гэта 60 000 злотых.

Гэта, вядома, толькі некаторыя прыклады падтрымкі, якія вынікаюць з уваходу ў Еўрасаюз праз некалькі месяцаў. Ужо цяпер варта задумацца над будучынёй гаспадарак, якія на Падляшшы мусяць у значнай ступені паддацца зменам.

Мацей Халадоўскі

Фота Крыстыны Касцевіч

Гайнавяне маглі пазнаёміцца з сучасным чыгуначным аўтобусам

Чыгункай у Белавежу і Бельск-Падляшскі

Таварыства прыхільнікаў чыгуначнай камунікацыі 26 ліпеня арганізавала ў Гайнаўцы сустрэчы з прадстаўнікамі самакіравання і жыхарамі горада.

— Ездзім мы па Польшчы, каб зацікавіць самаўрадавыя ўлады купляй чыгуначнага аўтобуса. Купіць такі аўтобус для адной гміны дорага, але для саюзаў гмін пры дапамозе маршалка ваяводства такая інвестыцыя пад сілу, — лічыць Яцак Панятоўскі, старшыня ўправы Таварыства прыхільнікаў чыгуначнай камунікацыі. — Гэта адзіны шанц, каб маглі захавацца пасажырскія перавозы на нерэнтабельных лініях.

— Мы зараз размаўляем з чыгуначнымі ўладамі ў справе перадачы нам лініі Гайнаўка — Белавежа. Ужо склалі ўступны праект да структурных фондаў у справе фінансавання нашай ініцыятывы. Тэма экалагічнага транспарту па Белавежскай пушчы вельмі актуальная і таму спадзяемся атрымаць фінансавую падтрымку на гэтую інвестыцыю. Калі б такі аўтобус ездзіў з Гайнаўкі праз Бельск-Падляшскі ў Беласток, то многа людзей ездзіла б ім. Чыгуначнага аўтобуса хапіла б нават для маршрута ў Седльцы, — заявіў намеснік гайнаўскага старасты Ежы Сірак.

Аляксей Мароз

Сігнал на трывогу

У спякотныя дні людзі скрываюцца ў цяньку дрэў або хлынуць над ваду. Рэпчыцкае вадасховішча маніць аматараў купання ды загарання. У палове чэрвеня быў здадзены ў карыстанне пункт пракату прылад для плавання. За 9 зл. (у гадзіну) можна пагуляць на водным ровары ці за 7 зл. паплаваць на лодцы. Над бяспекай купаючыхся наглядае ратаўнік. Зараз пляж закрыла санэпідэмстанцыя з-за забруджанай вады. Многія не зважаюць на забарону і купаюцца ў каламуце. Самае страшнае тое, што некаторыя адпраўляюцца далёка ад берага ў недазволенае месца.

27 ліпеня здарыўся выпадак. Сарокачатырохгадовы жыхар Гайнаўкі ўтапіўся. Гэта другі смяротны выпадак на Рэпчыцкім вадасховішчы. Няхай будзе ён перасцярогай тым, хто парушае правілы і законы. З вадою і агнём нельга жартаваць!

— Неаднойчы бачу, як хлопцы пад хмяльком ідуць купацца, — гаварыла дырэктар кляшчэлеўскага ГОК. — Зараз таксама пастаўлены знакі, якія не дазваляюць купацца. Але сілком нікога не выцягнеш з вады. Білетаў уступу Управа гміны не прадае, хоць ратаўнік знаходзіцца на пляжы.

Загінуў чалавек. Ці можна было пазбегчы трагедыі? Хапіла б паліцыі пракаціцца час ад часу побач вадасховішча і глянуць, як сябе паводзяць наведвальнікі. Чаму ж бы не прывесці ў парадак асобеня, які спажывае алкагольныя напіткі ці знаходзіцца на вадзе ў забароненым для купання месцы. Таму сігналю на трывогу. Час пакончыць з выпадкамі на вадзе!

Уладзімір Сідарук

Чым даехаць?

Дырэкцыя прадпрыемства ПКС у Бельску-Падляшскім спачатку была завесіла ў суботы, нядзелі і дзяржаўныя святы аўтобус з Нарвы ў Беласток цераз Іванкі, Агароднікі і Бялкі ў 6^{40} і выязджаючы з Беластока ў 9^{00} праз вышэй успомненыя вёскі ў напрамку Бельска-Падляшскага. Ад 1 ліпеня г.г. цалкам спынілі аўтобус выязджаючы з Нарвы ў Беласток. Тут найгоршая бяда старажылам, якія не маюць чым дабрацца ў Заблудаў ці Беласток. Гэтым аўтобусам карысталіся жыхары Іванкоў-Рагазоў, Ванева, Агароднікаў, Цісоў, Сакоў, Бялкоў, Гознай і Каўпакоў. Цяпер каб даехаць у Беласток, дык можна толькі ў 18^{50} з вёскі Бялкі аўтобусам, які курсіруе па трасе Гайнаўка — Беласток.

Настаў такі час, што няма каму апекавацца старэчамі і маладымі людзьмі на вёсках. Дырэкцыю прадпрыемства ПКС не цікавіць, што жыхарам вёсак няма чым даехаць у горад ды няма каму дапамагчы тым людзям. Варта, каб улады пацікавіліся гэтай справай.

Мікалай Лук'янюк

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2003 r. upływa 5 września 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

http://www.anekdotov.net/

„Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

Бацька ўваходзіць у пакой дачкі, якая забаўляецца вібратарам.

— Навошта табе вібратар? — пытае. — Ці не лепш было б, каб ты знайшла сапраўднага мужчыну?

— Але ж, татачка — вібратар намнога лепшы: не нап’ецца як свіння, не наб’е мяне, заўсёды буду ведаць дзе праводзіць ночы, не буду з ім сварыцца. Як бачыш — мае самыя станоўчыя вартасці.

На другі дзень дачка вяртаецца з працы. За сталом сядзіць бацька, а на стале красуюцца бутэлька гарэлкі, дзве чаркі і вібратар.

— Тата, — пытае дачка, — што здарылася?

— А што? Мо з зяцем нельга выпіць?

* * *

На лавачцы ў парку сядзіць пажылы мужчына. Дастае гадзіннік з левай кішэні, глядзіць на яго паказанні і хавае ў кішэню. Пасля з другой кішэні дастае другі гадзіннік і таксама фіксуе яго паказанні. Калі гэтыя дзеянні паўтарыў ён некалькі разоў, сядзячая побач яго жанчына спытала:

— Вы, хіба, праводзіце нейкія навуковыя даследаванні?

— Ды не. Я хачу толькі ўстанавіць, каторая гадзіна; у першым маім гадзіннік няма вялікай стрэлкі, а ў другім малой.

* * *

У спякотнае лета Коля выбраўся ў лес. Сустрэў там лесніка і пытае:

— Ці можна тут раскласці вогнішча?

— Нельга.

— А што тут робіць прыгарэлае галлё?

— Пакінулі яго тыя, што не пыталі пра дазвол.

* * *

Гутараць дзве сяброўкі:

— Маруся выходзіць замуж.

— Не гавары! А я і не ведала, што яна зацяжарыла.

* * *

У агародзе цюльпан шэпча ружы:

— Кахаеш мяне?

— Кахаю! — адказвае ружа.

— І прагнеш мяне?

— Аж свярбіць!

Настае хвіліна цішыні. Раптам цюльпан заенчыў:

— Ну, калі ж нарэшце прыляцяць тыя пчолы?!

* * *

— Як рашыць праблему перанаселенасці ў Кітаі?

— Дазволіць усім паляваць на буслоў.

* * *

Да зачытанага ў малітоўнік дзедкі падыходзіць унучак-студэнт:

— Што гэта дзедка так усё чытае і чытае?

— Рыхтуюся да апошняга ў жыцці экзамену.

* * *

Гутараць два сябры:

— Чуў я, што ты памяняў працу.

— Так, па прычыне здароўя.

— А што табе дакучае?

— Мне нічога, але мой начальнік калі на мяне гляне, дык заўсёды кажа, што яго цягне на ваніты.

* * *

Лекар да пацыенткі:

— Колькі вам будзе гадоў?

— Набліжаюся да саракоўкі.

— А з якога напрамку?

* * *

Гутараць дзве пенсіянеркі:

— Не ведаю як жыць з так нізкаю пенсіяй, калі ўсё такое дарагое...

— Коратка.

Адгаданка

Запавет

(амонім)

Да сыноў бацька азваўся за сталом:
— Дайце сабе зарок у шчырай дружбе жыць,
Каб брат _ _ / _ _ _ _ _ не шчэрыўся ваўком —
У вашых дачыненнях хай _ _ _ _ _ _ _ царыць!

(Ш)

Рашэннем амоніма з’яўляюцца два (або, бывае, і больш) словазлучэнні з аднолькава ўпарадкаваных літар. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Рашэнне адгаданкі з 26 нумара

Па абліччы апостал, а па зубах сабака.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Морганне чорных пум

На дзень да чарговага сходу ўселяснога кіраўніцтва мядзведзь Сандар Жоржавіч абышоў заходнія ўскраіны свайго лесу. З-за яго ўзлескаў, на суседняй тэрыторыі звочыў немалую групу выгульваючыхся чорных пум, якія што і руш пружыніліся, з цікаўнасцю спазіраючы ў бок ягонае лясное дзяржавы.

— Адкуль тут чорныя пумы? — падумаў.

На наступны дзень у час сходу Жоржавіч патрабаваў тлумачэнняў ад дзятла Стукача.

— Адкуль узяліся чорныя пумы?

Стукач, крыху заклапочаны, адказаў:

— Прывандравалі з варожага заакіянскага лесу. Узяліся ды размножыліся. Калі не будзем пільнымі, дык ўкараняцца і ў нас. А нам не трэба заакіянскага звера, да таго яшчэ і чорнага. Маем свой звярынец, адпаведнай, нашай масці.

Лань Гаўрусіха, якая даўно вымасціла сабе логава на заходняй мяжы лесу, бо там лягчэй нажэрціся, пры нагодзе выказала свой клопат:

— Я даўно адчуваю, што хтосьці мяне падглядвае. Нюхаю сабе кветачкі, а тут чую, што хтосьці моргае, плюскае на мяне вачыма, словам, лыбіцца на мяне. Вылізваю перад сном путавыя костачкі, а той зноў „луп-луп”, „плюсь-плюсь”! А тое плюсканне быццам звысока, з верхавін дрэў...

— Ага! — выразна знерваваны навінамі адказаў Сандар Жоржавіч. — Калі тыя паскуды так, то і мы гэтак! Калі яны хочуць моргаць, а можа і ўкараніцца ў нас, то і мы пачнем моргаць ды плюскаць на заходні лес. Яны морг, і мы морг. Загадваю, каб масава ўся лясная брацыя ад сёння па дзве гадзіны ў дзень моргала ў той бок з сушы і паветра. Аб’яўляю ўсенароднае морганне.

Традыцыйна, мядзведзь свой загад заверашыў у патрыятычна-паэтычным духу:

— Чорным пумам не дазволім, каб у вочы нас паролі.

Кіраўніцтва разбрылося па ўзлесках, абвяшчаючы новы загад.

Тым часам у заходняй частцы Жоржавічавага лесу паявілася тройка адшчапенцаў: змяя Ссапія, вуж Ззянон ды дзік Свіналыч. Дайшло ўжо да іх, што непадалёк ад іх намерыліся ўкараніцца іншыя адступнікі, іх брацкія, так сказаць, чорныя душы. Ссапія і Ззянон вырашылі: „Свіналыч вырые падземны калідор, каб маглі мы дапаўзці да чорных пум, па-іхняму кугураў, па добрую вестку”. І ў змроку пачалося вялікае рыццё.

А Сандар Жоржавіч, у сувязі з паяўленнем зараз за мяжой чорных пум, рыхтаваў у сваёй бярлозе заяву да усветнага пісьменнага звяр’я. Пачаў яе фразай: „Наш лес будзе рэагаваць на морганне морганнем. Не дазволім на самавольнае морганне ў наш бок. Пумава морганне лічым правакацыяй і змовай лясных інтэрзвераналаў. Лыбіцеся самі на сябе”!

МакХолад

Касмагонія

У працэсе касмагоніі дэмакратыя ўзнікла так: Бог падвёў Адама да Евы і сказаў:

— Выбірай сабе жонку!

У Беларусі маем свайго роду рэгіянальны плагіят стваральнага акту: прэзідэнт падстаўляе прэзідэнта і кажа:

— Выбірайце прэзідэнта!

Гэта з нашага боку Уладзімірскага лесу. З другога боку справы маюцца яшчэ выдатней: прэзідэнт Туркменістана аб’явіў сябе пажыццёвым прэзідэнтам ды альфай і амегай усяго тамашняга быту. Пад блакітным купалам збудаваў сабе небакрайны храм з пазалочанай свайго роду статуяй вышынёю ў семнаццаць метраў, памешчанай на тройчы вышэйшым пастаменце. Ды гэта не ўся яшчэ яго агіяграфія — тая статуя абарочваецца разам з ходам сонца. Гасцюючы ў Туркмен-башы казахскі прэзідэнт Назарбаеў заўважыў, што гэта не статуя рухаецца следам нябеснага свяціла, але сонца ходзіць згодна ўказам пальца прэзідэнта Ніязава...

І як быць цяпер той Капернікавай мадэлі сусвету? Вялікая пагроза павісла над нашым славутнейшым вучоным. Але гэта яшчэ не дробязь. Найчарнейшыя хмары збіраюцца над ягоным сучаснікам Хрыстафорам Калумбам, бо аль-Кайда і мусульманскія спецслужбы, як гэта раскрылі ананімныя агентуры, аб’явілі пошукі наследнікаў апошняга. Амерыку ахапіла паніка. Яшчэ зімою адзін амерыканец абскардзіў сваю суседку, што тая паставіла ў сваім агародчыку балвана. Ён скардзіўся быццам на тое, што суседка прычапіла балвану вялікія грудзі, але, мабыць, справа там не ў тым нават, што ён можа быць падобны да суседа, але ў тым, каб насцярожыць тамашнюю паліцыю на ўсялякія падазронасці. У нашай Польшчы, якая стала ў непарыўны саюз з Калумбавымі паслядоўнікамі, насцярожанасць бадай ці не большая, чым у актуальна „старэйшага брата”. Нядаўна была забаронена праца мастачкі Нязнальскай... (Дарэчы, гэтае „таемнае” прозвішча вельмі нагадвае савецкага мастака Неізвеснага, якога калісь кляйміў сам Хрушчоў, ды іх адносіны склаліся так, што той Неізвесны стаў пасля аўтарам помніка на магіле Хрушчова). А ў Польшчы пагроза пошукаў нашчадкаў Калумба такая, што міністр унутраных спраў Янік не расстаецца з папяросамі і ягонае ведамства было вымушана купіць свайму чынавенству сігарэты за 120 тысяч злотаў — вось якія там страсці!

Ёсць і страсці іншыя. Калі пішу гэтыя словы, былі разыграны ўжо першыя матчы першай польскай футбольнай лігі. І хаця яшчэ канчаткова не павінна быць вядома, якія каманды павінны там спаборнічаць, яны ўжо гуляюць у поўным камплекце. Ну, быццам нейкія рашэнні футбольных улад маюць быць абскарджаны і ў тэорыі сённяшнія пастановы могуць быць перайначаны, аднак здаецца, што барыш ужо выпіты. Улады польскага футбола вырашылі, што ў час правядзення адборачных матчаў у першую лігу рашаючую ролю сыгралі не футбалісты, але хабары. Дзіўны гэта вывад, бо ж сам наш першы міністр — уразрэз з меркаванямі арганізацыі Міжнародная празрыстасць (Transparency International) — публічна заявіў усенароддзю, што карупцыя ў публічнай сферы нашай краіны з’яўляецца абсурдам.

Бо і так у час чарговага стваральнага акта павесяць перад намі добра вядомыя партрэты і скажуць:

— Выбірайце дэпутатаў!

Аляксандр Вярбіцкі

ISSN 0546-1960